Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

23 КАСТРЫЧНІКА 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 207 (29321)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

ШАРАШЭВА: СПАЛУЧЫЦЬ СУЧАСНАЕ З ГІСТАРЫЧНЫМ

МС

ЯК ХІМІК-ІНФАРМАТЫК НАПІСАЎ БЕСТСЕЛЕР ПРА КАХАННЕ 20

ЦЫТАТА ДНЯ

Валерый САДОХА, дырэктар Нацыянальнага цэнтра маркетынгу МЗС:

«Анлайн-рынак Беларусі дэманструе адзін з самых высокіх тэмпаў росту ў Еўропе. І чакаецца, што гэты рост працягнецца. Аб'ём беларускага рынку электроннай камерцыі можа вырасці да $1,5 млрд у год. Таксама сістэма дзяржзакупак у нашай краіне перажывае лічбавую трансфармацыю, мэта якой у тым, каб спрасціць удзел у іх прадпрыемстваў і дзяржаўнага сектара».

СОНЕЙКІ ГАСПАДАРСКАГА ПОЛЯ

Жыхар пасёлка Вазнясенскі Чачэрскага раёна Аляксандр МЕЛЬНІКАЎ з сынам Антонам і дачкой Ясеніяй на гарбузовым ураджаі, які яны на трактары прывезлі з поля на падворак. У Мельнікавых — уласная падсобная гаспадарка, амаль дзесяць гадоў яны займаюцца вырошчваннем збожжавых, бульбы, буракоў, нарыхтоўкай сена, трымаюць дойны статак.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

КАРАТКА

- **У гэтым годзе ў дварах сталіцы ўжо высаджана 1,8 тысячы дрэў і 5 тысяч кустоў падчас акцыі «Зялёны двор разам!»**
- Паблізу пятага форта Брэсцкай крэпасці падчас земляных работ знайшлі больш за 1,2 тысячы патронаў.
- **Восем прадпрыемстваў Гомельскай вобласці сталі лаўрэатамі конкурсу «Найлепшы экспарцёр 2019 года».**
- Народная артыстка Беларусі Галіна Талкачова памерла ва ўзросце 86 гадоў.
- **Фотавыстаўка «Бабруйская крэпасць: 1810—2020» адкрылася ў музеі БДПУ.**
- Амаль 1650 кватэр для шматдзетных сем'яў пабудавалі ў Гомельскай вобласці ў студзені–верасні.
- **Ваеннаслужачым і тым, хто прайшоў тэрміновую службу, плануюць прапанаваць дадатковыя льготы.**

ISSN 1990 - 763X

Сацыяльны вектар

БЮДЖЭТ БЕЗ САКРЭТАЎ

На што трацяць дапамогу сем'і з дзецьмі

Штогод дзяржава фарміруе закон аб рэспубліканскім бюджэце на год, у якім адлюстравана структура даходаў і выдаткаў краіны. Асноўная частка даходаў — падаткі — больш за 80 %. Выдаткоўваюцца рэсурсы ў тым ліку на сацыяльную палітыку — выплаты пенсій, стыпендый, дапамог па цяжарнасці і родах і гэтак далей.

Напрыклад, у 2020 годзе на сацыяльную палітыку з рэспубліканскага бюджэту плануецца выдзеліць больш за 2,02 млрд. рублёў.

Але ўсё ж за вялікімі сумамі не бачна людзей. Наталля Сацук (прозвішча зменена) адзінокая шматдзетная маці, якая мае дзіця з асаблівасцямі ў развіцці. Яна згадзілася расказаць, якімі сумамі дзяржава дапамагае расціць дзяцей, і на што яе сям'я іх звычайна расходуе.

ДАПАМОГА ДЛЯ СЯМЕЙ З ДЗЕЦЬМІ

У Беларусі, як і ў многіх краінах, жанчыны, якія чакаюць папаўнення ў сямействе, могуць разлічваць на дапамогу па цяжарнасці і родах. Акрамя таго, прадугледжана аднаразовая выплата дапамогі жанчынам, якія сталі на ўлік у арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці (складае 1 БПМ (бюджэт пражытачнага мінімуму) — 256,1 руб.).

СТАР. 4

Будзьце пільныя!

Схадзіць на «Куфар» і застацца без грошай

На папулярным сайце можна сустрэць махляра, замаскіраванага пад пакупніка

«Лічбавыя жулікі», якія здымаюць грошы з чужых банкаўскіх карт, звычайна маскіруюцца пад інтэрнэт-рэсурсы, вартыя даверу. Сёлета ўлетку і восенню яны выдавалі сябе за «Куфар». Гэты папулярны і любімы многімі сэрвіс бясплатных прыватных аб'яў прыцягнуў увагу інтэрнэт-ашуканцаў тым, што шырока вядомы і карыстаецца даверам.

Дзве чытачкі амаль адначасова расказалі «Звяздзе» пра тое, як пазбавіліся (ці ледзь не пазбавіліся) сваіх грошай, прадаючы рэчы на «Куфары».

ГІСТОРЫЯ МАР'ЯНЫ

— Пляцоўка «Куфар» — такая бяскрыўдная, такая карысная. Так думае, напэўна, амаль кожны карыстальнік. Так падумала і я. Вырашыўшы разгрузіць кладоўку ад рэчаў, з якіх выраслі дзіця, я сфатаграфавала дзіцячую мэблю (стол і крэсла), устанавіла праграму на мабільны тэлефон, зарэгістравалася, паспяхова ўсё размясціла і стала чакаць пакупнікоў, — расказвае Мар'яна.

СТАР. 5

Дзеля агульнай бяспекі

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся ўчора з дырэктарам Службы знешняй разведкі Расіі Сяргеем Нарышкіным.

«Наша сустрэча створыць у гэты момант адпаведны выбух у сродках масавай інфармацыі, асабліва ў інтэрнэце, — сказаў беларускі лідар. — Ды мы не хаваем. Абстаноўка вакол нас вельмі няпростая, я маю на ўвазе Саюзную дзяржаву Беларусі і Расіі. Дзякуй вам за тую інфармацыю, што вы рэгулярна даяце нашым спецслужбам і мне ў тым ліку».

Прэзідэнт дадаў, што ў гэтым кірунку ў краіне вельмі шмат сумеснай работы: «У гэтым шалёным свеце, асабліва ашалелым ад пандэміі, у нас сяброў няшмат, будзем казаць шчыра. Ва ўсіх інтарэс да нас — Расіі і Беларусі. Мы павінны рэагаваць. Думаю, мы пра многае дамовімся — пра нашу сумесную работу і сумесную дзейнасць на карысць нашых народаў».

Сяргей Нарышкін у сваю чаргу падзякаваў за магчымасць сустрэцца, абмеркаваць пытанні саюзніцкіх адносін і перадаў прывітанне ад Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна.

«Я дзякую нашым калегам за тое, што мы тут сустракаемся, у чарговы раз праводзім сумесныя пасяджэнне калегій двух нашых спецыяльных службаў. Праводзім яго ў няпросты час. Я абсалютна згодны з ацэнкамі ступені напружанасці сітуацыі, якая існуе ў свеце ў цэлым і вакол нашых з вамі краін», — паведаміў Сяргей Нарышкін.

Ён выказаў упэўненасць, што «спецслужбы могуць зрабіць яшчэ шмат для таго, каб забяспечыць інтарэсы дзяржаў і абараніць грамадзян ад пагроз, што ўзнікаюць».

Марыя ДАДАЛКА.

❍ У ТЭМУ

Пасля сустрэчы Сяргей Нарышкін расказаў журналістам, што з Прэзідэнтам Беларусі ён абмеркаваў неабходнасць канцэнтрацыі намаганняў па забеспячэнні бяспекі краін, узмацненні супрацоўніцтва ў сферы эканомікі, ваеннай палітыкі.

Пасяджэнне калегіі Службы знешняй разведкі Расіі і Камітэта дзяржаўнай бяспекі Беларусі, якое адбылося ў другой палове дня, Сяргей Нарышкін назваў традыцыйным інструментам узаемадзеяння спецслужбаў. «Мы штогод на такіх пасяджэннях падводзім вынікі работы за мінулыя перыяды, строім сумесныя планы работы на будучыню», — дадаў ён.

Дырэктар Службы знешняй разведкі расказаў, што спецслужбы апошнім часам узмацнілі аналітычны складнік работы, прапаноўваюць свае прагнозы па пагрозах для дзяржаў; вядзецца абмен аператыўнай, разведвальнай інфармацыяй па супрацьдзеянні міжнароднаму тэрарызму.

«Нас цікавіць усё, што датычыцца транзіту тэрарыстаў, каналаў атрымання фінансавых рэсурсаў, планаў, задум тэрарыстычных арганізацый, асобных груповак, планы, якія яны выношваюць у дачыненні да Беларусі, Расійскай Федэрацыі, — канстатаваў кіраўнік спецслужбы. — Акрамя таго, Служба знешняй разведкі з задавальненнем прапаноўвае беларускім калегам нашы магчымасці па навучанні і падрыхтоўцы кадраў».

Сяргей Нарышкін пракаментаваў і ўнутрыпалітычную сітуацыю ў Беларусі, адзначыўшы, што стабільнасць — важная ўмова развіцця дзяржавы.

«Зразумела, што пратэсныя акцыі ставяць перад уладай шмат пытанняў. Уяўляецца, што прапановы Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі да пачатку канстытуцыйнай рэформы — адзін з адказаў на пытанні, што грамадства ці частка грамадства ставяць перад дзеючай дзяржаўнай уладай», — сказаў ён.

Сяргей Нарышкін назваў відавочнай наяўнасць знешняга ўплыву на падзеі ў Беларусі. Яго адзначаюць спецслужбы і Беларусі, і Расіі: «Мы бачым імкненне неканстытуцыйнымі метадамі паспрабаваць змяніць існуючы дзяржаўны лад, палітычную ўладу. Я ўпэўнены ў тым, што для Беларусі важная стабільнасць».

ДАНІНА ПАВАГІ ЛЕГЕНДАРНЫМ РАЗВЕДЧЫКАМ

Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

У Інстытуце нацыянальнай бяспекі ўшанавалі памяць легендарных савецкіх разведчыкаў, ураджэнцаў Беларусі Аляксея Бацяна і Юрыя Драздова. Мемарыяльную дошку ўрачыста адкрылі старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Беларусі Іван Тэртэль і дырэктар Службы знешняй разведкі Расійскай Федэрацыі Сяргей Нарышкін.

«Сёння ў нас адметная падзея — адкрыццё мемарыяльнай дошкі ў гонар славутых ураджэнцаў беларускай зямлі. Аляксей Бацян і Юрый Драздоў — два чалавекі няпростага лёсу, якія прайшлі Вялікую Айчынную вайну, вырашылі шэраг важных задач у інтарэсах Айчыны. Яны паказвалі прыклад патрыятызму і прафесіяналізму. Важна, што мемарыяльная дошка ў іх гонар адкрываецца ў сценах Інстытута нацыянальнай бяспекі, дзе рыхтуюцца кадры для Камітэта дзяржаўнай бяспекі. Упэўнены, што гэта знамянальная дата застанецца ў гісторыі інстытута і будзе служыць сур'ёзным выхаваўчым аспектам у падрыхтоўцы маладых кадраў», — адзначыў Іван Тэртэль.

«Для мяне і маіх калег вялікі гонар удзельнічаць у адкрыцці памятнай дошкі, прысвечанай легендарным разведчыкам. У год 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне мы аддаём даніну павагі людзям велізарнай волі і мужнасці, якія прысвяцілі сваё жыццё абароне бяспекі Радзімы. Аляксей Бацян прайшоў вайну ад першага да апошняга дня. Яго жыццё было напоўнена жаданнем дапамагчы людзям, ён сышоў з жыцця зусім нядаўна. Аляксей Мікалаевіч марыў адзначыць 75-годдзе Вялікай Перамогі і 100-годдзе расійскай знешняй разведкі, але, на жаль, яму гэта не ўдалося. Юрый Драздоў узначальваў нелегальную разведку Савецкага Саюза, ён стварыў аператыўна-баявое падраздзяленне «Вымпел». Прафесійныя лёсы Аляксея Бацяна і Юрыя Драздова — падручнікі, па якіх павінны вучыцца маладыя пакаленні, што вырашылі прысвяціць жыццё служэнню Радзіме», — падзяліўся Сяргей Нарышкін.

Значнасць прыкладу Аляксея Бацяна і Юрыя Драздова ў патрыятычным і прафесійным развіцці будучых разведчыкаў адзначыў і Павел Мажэйка, старшыня Беларускай грамадскай арганізацыі ветэранаў КДБ «Гонар». Ён падзякаваў Івану Тэртэлю і Сяргею Нарышкіну за праведзенае мерапрыемства.

Валерыя СЦЯЦКО.

Наша пазіцыя

Узаемадзейнічаць на аснове ўзаемнай павагі і аб'ектыўнасці

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Наталля Качанава звярнулася з адказам на сумесную заяву лідараў Савета Еўропы ў дачыненні да Беларусі ад 13 кастрычніка гэтага года, паведамляе БелТА.

«Лідары Савета Еўропы ў сваёй заяве дэкларуюць занепакоенасць падзеямі ў Беларусі, уяўленне аб якіх яны атрымліваюць на аснове аднабаковай інфармацыі. Мы неаднаразова звярталіся да еўрапейскай супольнасці, у тым ліку да кіраўнікоў парламентаў краін ЕС, з прапановай аб'ектыўна разабрацца ў тым, што адбываецца ў Беларусі, і правесці канструктыўны дыялог з прадстаўленнем неабвержаных фактаў, якія раскрываюць прычыны цяперашніх падзей, уключаючы ўмяшанне з-за мяжы. Аднак мы не былі пачутыя, нягледзячы на тое, што лідары Савета Еўропы заклікаюць у сваёй заяве захоўваць свабоду выказванні меркаванняў у якасці адной з асноўных еўрапейскіх каштоўнасцяў», — адзначыла Наталля Качанава.

У беларускай заяве падкрэсліваецца, што прадстаўнікі еўраатлантычных краін працягваюць карыстацца інфармацыяй, якая паступае выключна ад людзей, якія ў краіне не знаходзяцца і не прадстаўляюць большасць грамадзян, што падтрымалі падчас прэзідэнцкіх выбараў дзяржаўны курс, які праводзіцца ў нашай краіне. «Лідарам Савета Еўропы варта ведаць, што «мірныя» акцыі праходзяць па-за прававым полем і выклікаюць незадаволенасць многіх грамадзян Беларусі, якія просяць беларускія ўлады абараніць іх ад самавольства агрэсіўнай меншасці і аднавіць спакойнае, бяспечнае жыццё ў нашай краіне. Мы гатовыя да ўзаемадзеяння з замежнымі партнёрамі, да абмеркавання ўсебаковага супрацоўніцтва, уключаючы абмен меркаваннямі пра сітуацыю ў Беларусі, на аснове ўзаемнай павагі, аб'ектыўнасці, уліку інтарэсаў бакоў і неўмяшання ва ўнутраныя справы», — дадала Наталля Качанава.

Блізкая ўлада

ПА ВЕРТЫКАЛІ

Традыцыйна па суботах аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам праводзяцца прамыя лініі ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, папяратворчасці, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 24 кастрычніка, з 9.00 да 12.00 правядуць:

* намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

* старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Уладзіміравіч ЦЯРЭНЦЬЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

* першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Ігар Мікалаевіч ЧАСНОК. Тэл. 8 023 233 12 37;

* намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар Францавіч ПРАНЮК. Тэл. 8 015 273 56 44;

* намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Анатолевіч МАЛАШКА. Тэл. 8 022 250 18 69;

* намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч КРУЧАНАЎ. Тэл. 8 017 500 41 60;

* намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Юрый Уладзіміравіч ТРУШЧАНКА. Тэл. 8 017 222 44 44.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У выніку лічбавізацыі будуць скарочаны 85 мільёнаў працоўных месцаў

Лічбавізацыя бізнесу прывядзе да страты 85 мільёнаў працоўных месцаў у 26 краінах свету, папярэджваюць эксперты Сусветнага эканамічнага форуму ў дакладзе «The Future of Jobs 2020». Гэта адбудзецца ўжо ў 2025 годзе. Да гэтага часу кампаніі будуць дзяліць работу пароўну паміж людзьмі і машынамі. «Пандэмія COVID-19 паскорыла з'яўленне таго, што лічылася будучыняй рынку працы», — сцвярджае кіруючы дырэктар СЭФ Саадыя Західзі. Паводле яе слоў, аўтаматызацыя аперацый і наступствы рэцэсіі, выкліканыя каранакрызісам, узмацнілі няроўнасць на рынку працы. Пандэмія таксама звяла на нішто прырост занятасці, які адзначаўся пасля фінансавага крызісу 2007-2008 гадоў. «Акно магчымасцяў, якое ствараюць гэтыя змены для бізнесу, хутка зачыняецца», — заўважыла Західзі. У дакладзе СЭФ адзначаецца, што бягучая сітуацыя з пандэміяй і лічбавыя тэхналогіі стварылі для рынку працы ва ўсім свеце «сітуацыю падвойнага разбурэння».

Google упершыню за восем гадоў выйшаў з топ-3 найдаражэйшых брэндаў свету

Аб гэтым сведчаць дадзеныя штогадовага даследавання Interbrand Corp. за 2020 год. Google, які займаў у мінулым годзе другое месца, апусціўся на чацвёртую пазіцыю, паколькі яго кошт скараціўся да $165,4 млрд. Брэнд Apple застаецца найбольш дарагім у свеце на працягу васьмі гадоў запар: яго кошт павысіўся за мінулы год на 38 % і амаль дасягнуў $323 млрд. На другую пазіцыю з трэцяй выйшаў брэнд Amazon. Скачок яго кошту склаў 60 % (да $200,7 млрд) і стаў максімальным у рэйтынгу гэтага года. На трэці радок с чацвёртага падняўся Microsoft (рост на 53 % — да $166 млрд). Спіс астатніх кампаній у топ-10 не змяніўся, памяняліся месцамі толькі кампаніі на пятай і шостай пазіцыях: Samsung (рост на 2 % — да $62,3 млрд), Coca-Cola (падзенне на 10 % — да $56,9 млрд), Toyota (скарачэнне на 8 % — да $51,6 млрд), Mercedes-Benz (зніжэнне на 3 % — да $49,3 млрд), McDonald's (змяншэнне на 6 % — да $42,8 млрд), Disney (скарачэнне на 8 % — да $40,8 млрд). На першую дзясятку прыйшлася палова агульнага кошту брэндаў топ-100. Новымі ўдзельнікамі рэйтынгу сёлета сталі Instagram, YouTube і Zoom.

Цікавы досвед

ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ ФАНТАНА

У Гомелі ў яго чашы ўладкавалі пясочніцу

Той час, калі працаваў фантан каля цэнтральнага ўваходу ў парк «Фестывальны», што ў Савецкім раёне Гомеля, памятаюць толькі гамяльчане-старажылы. Адрамантаваць канструкцыю і выкарыстоўваць яе па прызначэнні ўжо было немагчыма. Раённыя ўлады прынялі рашэнне прыстасаваць пусты аб'ект пад новую гульнявую зону для дзяцей.

Фота gp.by

Чашу запоўнілі чыстым рачным пяском. Прывезці амаль 200 тон пяску ўзяліся будаўнічыя прадпрыемствы Савецкага раёна. Пасля на пляцоўцы ўсталявалі дзіцячы гульнявы комплекс і арэлі. Абсталяванне набылі за кошт сродкаў, зароблены жыхарамі раёна на суботніку, і спонсарскай дапамогі.

Прыватная кампанія «Рускі лес» дапамагла піламатэрыялам, з якога супрацоўнікі прадпрыемства «Кірмаш» вырабілі лаўкі для адпачынку дарослых, якія прыглядаюць за дзецьмі.

Работы на новай гульнявой зоне пакуль не поўнасцю скончаны. Для бяспечнага пад'ёму і спуску з пляцоўкі плануюць зрабіць драўляныя масткі, якія па дызайне будуць пераклікацца з архітэктурнай ідэяй ансамбля ўваходнай групы парку. Разглядаецца таксама пытанне дадатковага асвятлення пляцоўкі накшталт «зорнага неба» ў вячэрні час.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Надвор'е

ЦЯПЛО, ЗНОЎ АНАМАЛЬНАЕ ЦЯПЛО

У панядзелак прыгрэе да плюс 17 градусаў

Актыўныя цыклоны з Паўночнай Атлантыкі прыйшлі да нас не па сезоне. Гэтымі днямі яны пачалі перамяшчацца ва ўсходнім напрамку і перакрылі доступ арктычнаму паветру ў паўднёвыя шыроты. Таму ў Беларусі сталі ўладарыць вятры паўднёвых напрамкаў, якія прынеслі нам досыць цёплае паветра, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Вось і сёння надвор'е будуць вызначаць цёплыя паветраныя масы, якія паступаюць з тэрыторыі Заходняй Еўропы. Удзень па паўночнай частцы краіны адаб'ецца ўплыў франтальнага раздзелу. Тэмпература паветра ўдзень складзе 13—18 цяпла. Такі тэмпературны фон будзе на 4—9 градусаў вышэй за кліматычную норму.

У суботу на тэрыторыі краіны будзе пераважаць воблачнасць, якую да нас прынясе франтальная сістэма, што рухаецца з тэрыторыі Заходняй Еўропы. На большай частцы краіны пройдуць дажджы. У асобных раёнах чакаецца туман. Вецер прагназуецца ўмераны, пераменных напрамкаў. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 5 да 11 градусаў цяпла, удзень чакаецца 8—15 градусаў вышэй за нуль.

У нядзелю ноч пройдзе пад знакам дажджу, а ўдзень — пад знакам сонца. На большай частцы Гомельскай і Магілёўскай абласцей і месцамі ў іншых рэгіёнах краіны ў начныя гадзіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. А ўдзень атмасферны ціск будзе расці і дажджы спыняцца. Раніцай месцамі будуць згушчацца туманы. Вецер прагназуецца заходні, паўднёва-заходні слабы з узмацненнем да ўмеранага. Тэмпература паветра ўначы складзе 3—9 цяпла, а ўдзень ад плюс 8 да 15 градусаў вышэй за нуль.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, з панядзелка да серады надвор'е ў краіне будзе вызначаць цёплая перыферыя антыцыклону з цэнтрам над Сярэдняй Волгай. У асноўным абыдзецца без ападкаў. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах будуць згушчацца туманы. Вецер прагназуецца паўднёвы, паўднёва-ўсходні ўмераны. Асноўны тэмпературны фон уначы складзе 2—9 цяпла, а максімальны ўдзень — ад плюс 8 градусаў вышэй за нуль да 17 цяпла па паўднёвым захадзе краіны.

Сяргей КУРКАЧ.

Добрая навіна

РОЎМІНГ З РАСІЯЙ ПАТАННЕЕ

Два мабільныя аператары аб'явілі аб зніжэнні тарыфаў на роўмінг з Расіяй з 1 лістапада

Як паведамляецца на сайце кампаніі МТС, зменіцца кошт уваходных і выходных выклікаў. Змяненне тарыфаў адбываецца ў рамках дарожнай карты па рэалізацыі рэзалюцыі па пытанні аб адмене роўмінгу на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы, якая была распрацавана ў 2017 годзе.

Кошт уваходных званкоў падчас знаходжання абанента МТС на тэрыторыі Расіі складзе 11 капеек за хвіліну. Кошт выходных выклікаў у Беларусь пры знаходжанні ў роўмінгу ў Расіі складзе 22 капейкі за хвіліну, а выходных выклікаў на тэрыторыі краіны знаходжання — 55 капеек.

Зніжэнне кошту званкоў будзе распаўсюджвацца на ўсіх абанентаў МТС незалежна ад тарыфнага плана і сеткі расійскага аператара, у якой зарэгістравана мабільная прылада.

Цэны на SMS і інтэрнэт-трафік застануцца без змен. Разам з тым, з 1 лістапада абанентам МТС на тэрыторыі Расіі стане даступная паслуга «1 ГБ за мяжой»: яна ўключае 1 ГБ інтэрнэт-трафіка на сем дзён.

Мабільны аператар life :) таксама анансаваў, што з наступнага месяца зніжае цэны ў роўмінгу. Так, выходны званок у Беларусь будзе каштаваць 27 капеек за хвіліну, а выходныя па краіне знаходжання — 65 капеек (замест 1,6 рубля за хвіліну). Уваходны званок — 11 капеек за хвіліну размовы (замест 70). Зніжаецца таксама кошт SMS: 9 капеек замест 70. Каб камфортна карыстацца мабільным інтэрнэтам у роўмінгу, life :) запусціць новы пакет «Кожныя 0,1 ГБ у Расіі за 3 рублі». Падключыць пакет можна будзе на сайце life.com.by, у дадатку «Мой life :)» або праз USSD *8585#.

Пераход на новыя тарыфы адбудзецца аўтаматычна з 1 лістапада.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Беларусь памятае

СЦЕЖКАЙ БАЯВОЙ СЛАВЫ

У Мінскай вобласці стартаваў сумесны расійска-беларускі ваенна-патрыятычны праект «Сцяжынкай баявой славы». Ён створаны з мэтай аднаўлення помнікаў героям Вялікай Айчыннай вайны. Першае пасяджэнне рабочай групы па рэалізацыі праекта прайшло ў Смалявіцкім раёне.

Яго ўдзельнікі — прадстаўнікі райвыканкама, Мінаблвыканкама, праваслаўнай царквы, банкаў, навукоўцы. Гатоўнасць падтрымаць праект выказалі пасольства Расійскай Федэрацыі ў Беларусі. Ініцыятары абмеркавалі першы этап па рэканструкцыі мемарыяльнага комплексу «Разгром», які знаходзіцца на тэрыторыі Смалявіцкага раёна. Мемарыял прысвечаны гераічным старонкам найбуйнейшага партызанскага злучэння шматнацыянальнай брыгады. Гэтае фарміраванне налічвала каля дзвюх тысяч байцоў і дзейнічала на тэрыторыі некалькіх раёнаў Міншчыны. Лясныя салдаты пусцілі пад адхон трыста варожых эшалонаў і знішчылі больш як чатырнаццаць тысяч фашыстаў.

Месцам дыслакацыі брыгады стала паляна на мяжы Чэрвеньскага і Смалявіцкага раёнаў ва ўрочышчы «Стрыева». На тыя часы гэта былі балоцістыя мясціны, і вада залівала зямлянкі. Таму байцы будавалі дыхтоўныя шалашы, якія больш нагадвалі жылыя дамы. У лагеры працавалі збройная майстэрня, друкарня, шпіталь, школа падрыхтоўкі малодшых камандзіраў. У брыгадзе ваявалі тры сыны маці-патрыёткі Настассі Купрыянавай, помнік якой устаноўлены ў Жодзіне.

Напачатку памяць аб героях «Разгрома» ўшанавалі ў Мінску. Гэта была скульптура параненага партызана. Але пазней вырашылі, што помнік павінен стаяць на месцы дыслакацыі брыгады. У 1975 годзе ва ўрочышчы «Стрыева» ўрачыста адкрылі мемарыяльны комплекс, яго дапоўніла кампазіцыя з шасці скрыжаваных аўтаматаў, якая сімвалізуе шэсць атрадаў, што ўваходзілі ў баявое фарміраванне. За комплексам у раёне карпатліва даглядалі, рэгулярна добраўпарадкавалі тэрыторыю, наводзілі парадак. Аднак падчас апошняга ўрагану, які паласой прайшоў па Смалявіччыне, комплекс быў сур'ёзна пашкоджаны — разбураны пліты, рэшткі партызанскіх дамоў.

Удзельнікі рабочай групы дэталёва абмеркавалі ўсе моманты, канкрэтныя дэталі па аднаўленні мемарыялу і намецілі план дзеянняў. Вырашана адкрыць дабрачынны рахунак для рэканструкцыі памятнай мясціны. Паўдзельнічаць у добрай справе могуць усе ахвотныя. Мяркуецца, што неабходныя работы правядуць да 3 ліпеня наступнага года.

Гэтыя тэрміны ўхваліў скульптар Аляксандр Шапо. Па яго словах, будзе падрыхтаваны эскіз, зроблена мадэль у мяккім варыянце. Ён запрасіў удзельнікаў рабочай групы наведацца ў майстэрню, азнаёміцца з папярэдняй распрацоўкай.

На пасяджэнні абмеркавалі таксама, з чаго будзе выраблена кампазіцыя. Выказвалася думка, што магчыма варта захаваць ранейшы матэрыял. Але канчатковы вердыкт будзе вынесены пасля падрыхтоўкі каштарысnай дакументацыі.

Адзінае, што параіў скульптар: не варта выкарыстоўваць бетон, паколькі яго якасць цяпер не тая, што была раней. Акрамя таго, Аляксандр Шапо прапанаваў зрабіць дыхтоўныя таблічкі і ўстанавіць відэакамеры побач з мемарыялам, каб пазбегнуць выпадкаў вандалізму.

Удзельнікі групы паглядзелі таксама кароткаметражны фільм «Сцяжынка баявой славы». Ён распачынае серыю стужак, прысвечаных партызанскаму руху Беларусі. Плануецца, што фільмы размесцяць у сеціве, пакажуць на каналах беларускага і расійскага тэлебачання.

Усяго ж на тэрыторыі Смалявіцкага раёна знаходзіцца больш як 120 памятных мясцін. Рэалізацыя праекта дасць магчымасць папрацаваць над паляпшэннем інфраструктуры, стварэннем турыстычных маршрутаў, паспрыяе патрыятычнаму выхаванню моладзі.

Удзельнікі праекта лічаць, што вопыт паспяховага аднаўлення комплексу можа быць распаўсюджаны на тэрыторыі Беларусі і Расіі.

Разам з тым яны наведалі дзіцячы сад-базавую школу ў аграгарадку Клянік, дзе створаны музей, прысвечаны слаўным старонкам партызанскай гісторыі. Тут для іх правялі экскурсію «Памяць пакаленняў».

Менавіта ў гэтай вёсцы байцы «Разгрома» злучыліся з часцямі Чырвонай арміі. На мясцовых могілках за гады вайны было пахавана некалькі дзясятка воінаў брыгады.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Навука

ЗВЕРХУ ВІДАЦЬ УСЁ...

Інфармацыю з космасу будуць выкарыстоўваць для пошуку радовішчаў нафты

Вучоныя Белдзяржуніверсітэта распрацавалі тэхналогію прагнозу нафтаперспектыўных аб'ектаў на аснове даных дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі. Яе аўтарамі з'яўляюцца супрацоўнікі факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі пад кіраўніцтвам прафесара кафедры рэгіянальнай геалогіі Валерыя Губіна.

Да гэтага часу ў Беларусі пры пошуку радовішчаў нафты касмічныя даныя дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі ўжываліся абмежавана. Інавацыйная тэхналогія заснавана на комплексным аналізе сейсмічнай інфармацыі з касмічных здымкаў, у тым ліку атрыманых з Беларускага касмічнага апарата.

Вынікам апрацоўкі звестак з'яўляюцца космаструктурныя карты, на якіх адзначаны нафтаперспектыўныя зоны. Карты дазваляюць скараціць колькасць сейсмічных даследаванняў, павышаюць аб'ектыўнасць прагназавання радовішчаў нафты і паскараюць працэс вызначэння ўчасткаў для правядзення буравых работ.

Акрамя таго, асновы інавацыйнай тэхналогіі плануецца выкарыстоўваць у навучальным працэсе пры падрыхтоўцы інжынераў-геолагаў на факультэце геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання САЎКО Валерыя Іосіфавіча і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.

БЮДЖЭТ БЕЗ САКРЭТАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Для сем'яў з дзецьмі прадугледжаны больш за дзесяць відаў дзяржаўных дапамог. Напрыклад, у сувязі з нараджэннем дзіцяці выплачваецца аднаразовая дапамога. За нараджэнне першага дзіцяці сёння сям'я можа адначасова атрымаць 10 БПМ — 2561 руб. За нараджэнне другога дзіцяці і наступных — 14 БПМ (3585,4 руб.) Да наступлення трохгадовага ўзросту дзіцяці выплачваецца дапамога па доглядзе — з 1 жніўня 2020 года гэтая сума складае 427,84 рубля. Дапамога па доглядзе за другім (трэцім, чацвёртым і г. д.) дзіцем, якая таксама выплачваецца да дасягнення ім узросту трох гадоў, складае 488,96 руб.

У некаторых выпадках сем'і могуць прэтэндаваць на падтрымку ў выглядзе бясплатнага харчавання для дзяцей ва ўзросце да 2 гадоў: напрыклад, калі ў сям'і з'явіліся двайняты або трайняты.

ДАПАМОГА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Наталля мае чатырох дзяцей і ўсе выплаты пры іх нараджэнні яна атрымлівала ў пэўны тэрмін.

«Я дакладна ведала, у які дзень і колькі атрымаю, таму прыкладна магла прыкінуць, што наша сям'я можа сабе дазволіць», — прызналася Наталля. Яна, як і многія шматдзеныя, ужо пабудавала кватэру і лічыць гэта значнай падтрымкай з боку дзяржавы.

Немалая эканомія сямейнаму бюджэту — бясплатнае харчаванне дваіх дзяцей у школе на працягу года і дапамога дзяржавы на школьныя рэчы, якая складала прыкладна 80 рублеў на кожнага школьніка. Яна выплачваецца адзін раз перад пачаткам навучальнага года. Яшчэ адно дзіця ў Наталлі наведвае садок. Аплата за яго наведванне атрымліваецца прыкладна на 50 працэнтаў меншая, чым у іншых бацькоў.

«Я выдаткоўваю на дзіцячы садок каля 40 рублёў штомесяц. Ведаю, што іншыя бацькі плацяць па 80 рублёў. Дзіця знаходзіца цэлы дзень пад наглядам дарослых, атрымлівае гарачае харчаванне. На самай справе гэта вельмі добрыя ўмовы», — лічыць шматдзетная маці.

Прыемныя і невялікія бонусы для шматдзетных у крамах, а таксама салодкія навагодніе падарункі пад Новы год ад мясцовага выканкама.

КАЛІ ЁСЦЬ ІНВАЛІДНАСЦЬ

Дапамога на дзіця з інваліднасцю ва ўзросце да 3 гадоў зараз складае 550,08 руб.; ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў — 256,1 руб. або 307,32 руб. (залежыць ад групы інваліднасці). Бацькі дзіцяці-інваліда таксама маюць права на атрыманне сацыяльнай адраснай дапамогі на набыццё школьных рэчаў, лекаў, адзення і іншага.

Дапамога па доглядзе за інвалідам I групы або асобай, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту, пры ажыццяўленні догляду за адной асобай складае 256,10 руб., за дзвюма і больш — 307,32 руб.

Наталлін дзесяцігадовы сын мае чацвёртую ступень страты здароўя, таму жанчына дадаткова атрымлівае яшчэ і дапамогу на яго асобна, на сябе і дапамогу на астатніх дзяцей, якая аказваецца сем'ям, што выхоўваюць дзіця з інваліднасцю (каля 130 рублеў на здаровых і 170 на дзіця з асаблівасцямі ў развіцці). У выніку Наталля атрымлівае «на рукі» каля 1250 рублёў штомесяц на сям'ю з пяці

чалавек (бацькі няма). Праз месяц яна выдаткоўвае з сямейнага бюджэту каля 100 долараў на масаж дома сыну з інваліднасцю.

«Увогуле раз на паўгода нам прызначана бясплатная рэабілітацыя з масажам, але, на жаль, у нас не атрымліваецца прайсці рэабілітацыю курсам, — расказвае Наталля.— Я пачынаю вазіць сына на працэдуры, і ён праз тры–чатыры дні падхоплівае інфекцыю. Прыходзіцца заставацца дома і лячыцца. У мяне сын не ходзіць, таму яму неабходны масаж, і я знайшла такое выйсце. Тады ў сына ёсць шанц да канца курса масажу не захварэць».

Інвалідную каляску і спецыяльны абутак для сына Наталля атрымлівае бясплатна.

За кватэру яна плаціць штомесяц прыкладна 80 рублёў, з ацяпленнем трохі больш, на інтэрнэт ідзе каля 40 рублей, за электраэнергію — 40 рублёў, мабільная сувязь яшчэ каля 40 на ўсіх членаў сям'і; старэйшая дачка рыхтуецца да паступлення, і таму сям'і яе падрыхтоўка сёлета абыходзіцца прыкладна ў 180 рублёў штомесяц. Дзеці наведваюць розныя секцыі і гурткі: падрыхтоўчая група музыкальнай школы — 40 рублёў, каратэ — 30, шахматы — 33 рублі. Яшчэ Наталля выдзяляе старшай дачцэ прыкладна раз на год каля 150 рублёў на адзенне, бо яна ўжо амаль дарослая і ёй хочацца самой нешта выбіраць сабе ў крамах.

«У гэтым годзе я і сабе набыла летні абутак, які каштаваў трыццаць рублёў. Але ўсё ж гэта было залішняе. З адзеннем мне дапамагае Асацыяцыя шматдзетных сем'яў; бывае, што знаёмыя аддаюць добрыя рэчы. Чалавек я запаслівы і вельмі акуратны, таму адзенне ўжо амаль некалькі гадоў не набываю».

Усё, што застаецца пасля таго, як набудуць мыйныя сродкі, сям'я траціць на прадукты.

«Ну, наша сям'я — «малаежкі», — смяецца Наталля. — Асноўны рацыён — гэта крупы, гародніна, супы. Не кожны дзень, але ўсё ж і мяса ядзім, у асноўным набываю курынае. Але гэта не з прычыны эканоміі, а з-за таго, што мае дзеці не любяць іншае. Раней хадзілі час ад часу ў аквапарк — малыя яго вельмі любяць, і там ёсць зніжкі для шматдзетных. Але з-за каранавіруса мы пакуль адкладваем такія паходы. А ўвогуле я ўсім задаволена! Разумею, што мы не можам сабе дазволіць паездкі на мора, памяняць мабільнікі на больш сучасныя і якасныя і іншае, але ўсё роўна не лічу сябе беднай. Збольшага мая сям'я мае ўсё неабходнае для жыцця».

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 25.11.2020 открытого аукциона

Лот № 1: линия по переработке и брикетированию древесных отходов (инв. № 0710316) в составе: теплогазогенератор ТГГ-650, питатель сырой массы ПСМ 08, виброситo, транспортер загрузки, сушильный барабан АВМ-0.65, циклон технологический, дробилка молотковая ДМ 1500, транспортер подачи, бункер наполнитель БН-2, шнековый пресс АСБР 50, электрошкаф, устройство определения влажности опилок, система дымоудаления. Местонахождение: Могилевский р-н, Кадинский с/с, д. Черемушки.
Начальная цена продажи – 92 125,04 бел. руб. с НДС.
Сумма задатка: 9 212,50 бел. руб.

Лот № 2: форвардер Амкодор 2661, 2010 г. в., р/з ТВ-6 8952, з/н 0100101, инв. № 00710279. Местонахождение: г. Могилев, пер. Гаражный, 10.
Начальная цена продажи – 100 000.00 бел. руб. с НДС.
Сумма задатка: 10 000.00 бел. руб.

Лот № 3: харвестер Амкодор 2551, 2011 г. в., р/з ТВ-6 8951, з/н 0077, инв. № 70. Местонахождение: г. Могилев, пер. Гаражный, 10
Начальная цена продажи – 100 000.00 бел. руб. с НДС.
Сумма задатка: 10 000.00 бел. руб.

Лот № 4: грузовой автомобиль ZIL-131, 1983 г.в, р/з АВ 1407-6, № кузова (рама) 556103, цвет – зеленый, тип – грузовой фургон, инв. № 2814. Местонахождение: г. Могилев, пер. Гаражный, 10
Начальная цена продажи – 6 240,00 бел. руб. с НДС.
Сумма задатка: 624,00 бел. руб.

Аукцион состоится 25 ноября 2020 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Подача заявок (осуществляется лично) и внесение задатка: по 24.11.2020 до 15.00 в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее чем за три дня до даты аукциона

Расчетный счет для внесения задатка:
получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182,
р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000
в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

Продавец: ОАО «Могилевдрев», УНП 700049449, г. Могилев, пер. Гаражный, 10

Порядок проведения аукциона: для участия в аукционе приглашаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, которые внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, своевременно подали заявление на участие в аукционе со всеми необходимыми документами, заключили с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон. Лот продается без условий на открытом аукционе с применением метода повышения начальной цены, с шагом пять процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Единственный участник имеет право приобрести объект продажи по начальной цене, увеличенной на 5 %

Срок и условия оплаты: победитель аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона, включающие в т. ч. затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона в соответствии с выдаваемым счетом-фактурой. Победитель аукциона обязан в течение 20 (двадцати) календарных дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Условия оплаты – 100 % предоплата. Задаток, внесенный для участия в аукционе Победителем аукциона, засчитывается в счет уплаты за предмет аукциона

Организатор аукциона: Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, тел. +375 222 72-41-14, Mogilev@ino.by

Доп. информацию можно получить:
+375 29 624-26-25, +37529-550-09-56, и на сайте ino.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Минский Агросервис» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе

Объекты недвижимости:

- административное здание с инв. № 600/С-120828 общей площадью 395,3 кв. м;
- склад с инв. № 600/С-120830 общей площадью 472,6 кв. м;
- мастерская, инв. № 600/С-120832, общей площадью 523,1 кв. м;
- благоустройство площадки Заславль, инв. № по бух. учету 00115, общей площадью 523,1 кв. м;
- ограждение, инв. № по бух. учету 00110, протяженностью 322 м.

Оборудование:

- комплектная трансформаторная подстанция ГКТП-1346 (160 кВа), инв. № бух. учету 20040984;
- комплектная трансформаторная подстанция ГКТП-1417 (400 кВа), инв. № бух. учету 20040985 (далее – Объекты).

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 623650100001003002 площадью 0,4868 га (право постоянного пользования) по адресу: Минский район, г. Заславль, ул. Гагарина, 21а.

Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: охранная зона трансформатора, пл. 0,0166 га; охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0360 га.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 741 180,00** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены (**74 118,00** бел. руб.).

Задатки перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объектов производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона, в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **25.11.2020** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.11.2020** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17.

УНП 690654790

А не шкодзь!

Браканьераў затрымалі з буйнымі ўловамі

Возера Чорнае ў Бярозаўскім раёне — у арэндзе ў мясцовага рыбгаса, тут дазволена прамысловая лоўля рыбы. Аднак, як стала вядома інспектарам Бярозаўскай міжрайінспекцыі, некаторыя ўловы рыбалавецкай брыгады праходзілі міма «касы».

Па правілах, прычаліўшы да берага, прамысловая брыгада перадусім павінна адсартаваць і ўзважыць улоў, унесці гэтыя даныя ў тоневы журнал і толькі потым прыступаць да транспарціроўкі рыбы. Каб зафіксаваць парушэнне такога кшталту, інспектары вялі скрытую відэаздымку дзеянняў рыбакоў, якія былі на лоўлі. Працавалі ў той дзень дзевяць чалавек разам з брыгадзірам. Як і меркавалася, звесткі пра ўлоў, які апынуўся на рэдкасць буйны — больш за 133 кілаграмы, у журнал не ўнеслі. Рыбу адразу ж загрузілі ў аўтамабіль і некуды павезлі.

Па дамоўленасці з інспекцыяй, у вёсцы Хрыса аўто спынілі для праверкі супрацоўнікі ДАІ і службы БЭЗ Бярозаўскага РАУС. Затрыманыя рыбакі прызналіся ў крадзяжы: улоў яны планавалі прадаць, а грошы падзяліць паміж сабой. Цяпер ім пагражае крымінальная адказнасць.

Небяспека такіх крадзяжоў не толькі ў прычыненні ўрону прадпрыемству-арандатару (улоў ацанілі ў 428 рублёў), але яшчэ і ў бескантрольным спусташэнні вадаёмаў, бо вылаўленая «цішком» рыба не пойдзе ў залік выдзеленай на промысел квоты, падкрэслілі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслінага свету.

Не першы раз рашыўся на незаконнае рыбалоўства і браканьер з Вілейкі. Ноччу на беразе Вілейскага вадасховішча ён спустошыў устаноўленыя напярэдадні сеткі, схаваў свае прылады ў прыбярэжных кустах і пачаў загружаць ванначкі з рыбай у машыну. У гэты момант яго затрымалі аператыўнікі Дзяржінспекцыі.

Ва ўлове вагой 41 кілаграм апынуліся судак, лешч, шчупак, акунь і плотка. Прычыненая прыродзе шкода ацэньваецца ў 3,8 тысячы рублёў. У дачыненні да браканьера заведзена крымінальная справа. Вядома, што на яго рахунку маецца яшчэ адна нядаўняя судзімасць — за незаконную лоўлю рыбы ў 2018 годзе. Гэта можа стаць абцяжваючай акалічнасцю ў судзе.

Адборных ляшчоў вагой каля 2,5 кілаграма кожны налавілі двое работнікаў Таварыства ратавання на водах на Заслаўскім вадасховішчы. 70-метровую сетку ўстанавілі і здымалі на службовай лодцы. Увесь улоў, а гэта 22 ляшчы, пацягнуў амаль на 58 кілаграмаў. За лоўлю рыбы забароненымі прыладамі затрыманым пагражае да 50 базавых велічынь штрафу, яшчэ каля 1,8 тысячы рублёў прыйдзецца выплаціць у якасці кампенсацыі нанесенай прыродзе шкоды.

Дарэчы, недалёка ад выратавальнай станцыі інспектары выявілі яшчэ адну сетку. У ёй заблыталася не толькі рыба (дзесяць асобін), але і рэдкая для нашых месцаў пералётная птушка — гагач чырванаваллёвы. І яе, і рыбу выпусцілі на волю.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Схадзіць на «Куфар» і застацца без грошай

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аб'яву дзяўчына размясціла прыкладна ў 17.30, а ўжо ў 18.40 стала ахвярай махляроў.

— У аб'яве быў паказаны мой мабільны, да якога прывязаны «Вайбер». Праз 20 хвілін пасля размяшчэння аб'явы ў ім прыйшло два паведамленні практычна адначасова. Ад Марыі — з мілым катком на аватарцы, і ад Алены Звягінцавай. Абедзве хацелі купіць камплект мэблі.

Мець стасункі Мар'яна вырашыла з Марыяй, бо яна даслала паведамленне на некалькі секунд раней Алены. «Пакупніца» праявіла зацікаўленасць, удакладніла, з якога матэрыялу зробленая мэбля, сказала, што драпіны не важныя, бо мэбля не новая. Спытала, ці не спяшаецца Мар'яна з продажам, таму што заехаць забраць мэблю яна зможа толькі ў выхадныя.

— Я напісала, што не спяшаюся, але паралельна яшчэ адна дзяўчына зацікавілася дзіцячай мэбляй. На гэта ад Марыі прыйшло паведамленне: «Не прадавайце пакуль, калі ласка. Параюся з мужам». У гэты ж час другая «пакупніца» (Алена) удакладняе: «Ну што? Прадалі?»

Неўзабаве, тлумачыць Мар'яна, ад першай «пакупніцы», Марыі, прыходзіць паведамленне: «Мы апладзілі, каб вы не сумняваліся. Мы прыедзем».

— Я, натуральна, не разумею, каму апладзілі, куды? Задаю пытанне. Марыя дасылае спасылку. Я, усё яшчэ не разумеючы, праходжу па спасылцы... а там старонка «Куфара», амаль як сапраўдная. Амаль. Але гэта я зразумела, калі было ўжо позна...

Паралельна прыйшло СМС-паведамленне: «Ваш тавар «Дзіцячая мэбля» аплочаны, 70 BYN».

— Прызнаюся, нейкія думкі пра тое, што тут нешта не так, у мяне былі. Але я страціла пільнасць і пачала ўводзіць усё, што ад мяне патрабавалася. А трэба было ўвесці даныя карткі, як пры звычайным пераводзе праз інтэрнэт-банкінг. Запыталі CVC-код. І яго я ўвяла. Я ўводзіла яго пры куплі тавараў на «Аліэкспрэс» і ніколі не было праблем.

Перайшоўшы далей, Мар'яна ўбачыла наступнае: «Залічэнне сродкаў. Для атрымання сродкаў на ваш нумар адпраўлена SMS з кодам пацвярджэння». Прыйшоў код пацвярджэння, і дзяўчына яго ўвяла. Потым быў запыт: увядзіце рэшту на карце для пераводу грошай.

— І вось тут бы ўключыць нарэшце розум! — кажа Марыяна. — Але... рэшта была ўведзена, і праз некалькі секундаў гэтая самая рэшта — усе грошы з карткі перавандравалі на нечы рахунак. Так, я сама вінаватая. Няхай мой сумны вопыт стане для кагосьці ўрокам! Бо ў некага рэшта на карце можа быць у разы большая за маю. Як сказалі ў кол-цэнтры банка, за апошнія пару тыдняў такіх выпадкаў — велізарная колькасць. Я зразумела, што людзі не ведаюць ашуканскіх схем і памыляюцца гэтак жа, як і я. Грошы сыходзяць на замежныя рахункі. Вярнуць іх немагчыма.

Мар'яна ўпэўнена, што ў яе гісторыі быў не адзін, а два махляры (махляркі), якія дзейнічалі разам, каб стварыць ажыятаж, попыт на тавар.

— На наступны дзень «Алена» ў «Вайберы» стала проста нумарам замежнай дзяржавы. Таксама, ужо разважаючы над гэтай гісторыяй, я заўважыла, што па спасылцы, якую скінула мне «Марыя», пасля слова kufar былі літары «vc». Але ж такога не можа быць! Толькі «by»! Адрас ашуканскага сайта можа нязначна адрознівацца ад сапраўднага (напрыклад, kufar.cc або kufar.store), а дызайн будзе вельмі падобны на сапраўдны.

ГІСТОРЫЯ КАЦЯРЫНЫ

Кацярына выставіла на продаж дзіцячы самакат. Сын падрос, і яму набылі новы, а ранейшы, маленькі, быў яшчэ цалкам у рабочым стане. На «Куфары» наогул значная частка прадаўцоў і пакупнікоў — гэта мамы. Тут яны прадаюць або абменьваюць дзіцячыя рэчы, а часам і проста дораць тое, з чаго выросла іх дзіця, для жанчын з маленькімі дзеткамі — выключна карысны рэсурс. Кацярына, мама траіх дзяцей, прадавала і купляла на «Куфары» рэчы ўжо шмат разоў. Як звычайна, яна размясціла аб'яву, на гэты раз аб продажы самаката, і хвілін праз 20 атрымала паведамленне ад нейкай Анжэлы. Тая цікавілася станам самаката, і неўзабаве зносіны з сайта «Куфара» перайшлі ў «Вайбер». Гэта не насцярожыла Кацярыну.

— У мам заўсёды шмат спраў, і тое, што са мной можа перапісвацца махлярка, мне проста не прыйшло ў галаву, — кажа Кацярына. — Хоць, вядома, я чула пра інтэрнэт-махляроў і махінацыі з банкаўскімі карткамі. Але чамусьці заўсёды здавалася, што мяне гэта не закране.

Аб продажы дамовіліся хутка, Анжэла напісала, што кошт яе задавальняе, але сама яна з Брэста і прыехаць за таварам не можа. Прапанавала скарыстацца службай дастаўкі.

— Я адказала, што раней дастаўкай не карысталася, і «пакупніца» ахвотна растлумачыла мне: яна аплачвае тавар, пасля чаго адпраўляе мне спасылку. Я аўтарызуюся, атрымліваю грошы і пасля гэтага адпраўляю ёй тавар праз кур'ера, — расказала чытачка. — Усё быццам бы ясна, але я вырашыла стэлефанавацца з пакупніцай. Раней мы з мамамі, якія прадавалі мне ці купляліі ў мяне рэчы, заўсёды размаўлялі па «Вайберы», а не толькі перапісваліся. Але «Анжэла» не адказала на званок у «Вайберы». Не тое каб гэта мяне насцярожыла, але здалося дзіўным, бо мы толькі што з ёй перапісваліся.

Чытачка перайшла па спасылцы. Назву сайта яна не запомніла, але яго дызайн быў такі ж, як дызайн «Куфара». Запоўніла ўсё, што патрабавалася, — прозвішча, імя і імя па бацьку, адрас і даныя банкаўскай карткі, у тым ліку CVC-код (які пры пераводзе грошай на картку наогул не патрабуецца!).

— Але я ўнесла даныя карткі з мінулага месца работы (яе тэрмін прыдатнасці яшчэ не скончыўся), на якой у мяне амаль не было сродкаў — заставалася капеек 20. Не ведаю, чаму я не ўпісала даныя сваёй зарплатнай карткі. У апошні момант перадумала — і, як я цяпер разумею, гэта было вельмі правільным рашэннем.

Пасля гэтага «Анжэла» знікла і на паведамленні больш не адказвала.

У ЧЫМ СУТНАСЦЬ МАХЛЯРСТВА?

Відавочна, што мэта, да якой імкнуцца ашуканцы, — прымусіць уладальніка банкаўскай карткі перадаць ім даныя аб ёй. Схема, абкатаная жулікамі даўно — на многіх рэсурсах, дзе нешта прадаюць і купляюць. «Пакупнік» выходзіць на сувязь у адным з месенджараў, распытвае аб тавары і заваёўвае давер будучай ахвяры. Як правіла, прадстаўляецца махляр жаночым імем — вядома, што ім давяраюць больш. «Пакупнік» выказвае жаданне купіць ваш тавар па перадаплаце і высылае спасылку на фэйкавую старонку, дзе прадавец павінен увесці даныя сваёй банкаўскай карты — нібыта каб атрымаць грошы. Як толькі даныя ўведзены, махляр атрымлівае доступ да рахунку прадаўца.

Яшчэ адзін варыянт таго ж «разводу»: калі ўсе дэталі куплі-продажу агавораны і дамоўленасць аб продажы дасягнута, высвятляецца, што ўяўная «пакупніца» жыве далёка ад вас. Тут і згадваецца «служба дастаўкі». Вам прапануецца перайсці на падроблены сайт, дызайн якога маскіруецца пад сайт, на якім вы размясцілі аб'яву аб продажы. У URL падстаўнога сайта ёсць назва гэтага рэсурсу плюс некалькі «лішніх» знакаў і літар. Перайшоўшы па спасылцы, вы запаўняеце «таблічку»: прозвішча, імя, даныя банкаўскай карты — «А іначай як жа вам перавядуць на яе грошы?» І тым самым даяце ашуканцу ключ да вашых грашовых сродкаў, якія знаходзяцца на картцы.

Сутыкнуцца з падобным падманам можна не толькі на «Куфары» — глебай для махлярства могуць стаць інтэрнэт-пляцоўкі любых вядомых брэндаў, якім давяраюць спажыўцы і якія ахвотна наведваюць карыстальнікі.

Распрацоўшчыкі платформы «Куфар» выявілі і іншыя ашуканскія схемы, мэта якіх — перавесці грошы з картак даверлівага пакупніка на ўласныя рахункі.

Напрыклад, злачынец «выстаўляе на продаж» тавар па вельмі нізкай цане. Калі пакупнік піша яму, ён пераносіць стасункі ў месенджар. І ўгаворвае на перадаплату або дастаўку. Каб развеяць сумневы, кажа аб новай паслузе халдзіравання сродкаў, якая з'явілася на «Куфары»: калі дастаўкі не будзе, «Куфар» аўтаматычна верне сродкі на карту. І высылае спасылку на падробленую старонку, як дзве кроплі вады падобную на старонку «Куфар Дастаўкі». Далей усё адбываецца па вядомым сцэнарыі: карыстальнік уводзіць даныя сваёй карткі, і з яе спісваюцца ўсе сродкі.

Уласна кажучы, аб ашуканскіх схемах з банкаўскімі карткамі і пра тое, як ад іх засцерагчыся, СМІ ў апошні час пісалі досыць часта. Але такая ўжо чалавечая псіхалогія: мы не звяртаем увагі на падобную інфармацыю, пакуль гэта не закране нас асабіста. А спісаннем сродкаў з карткі матэрыяльныя страты (і проста нязручнасці) ахвяры махлярства не абмяжоўваюцца.

— Мне давялося ў той жа вечар блакіраваць карту, — кажа Мар'яна. — На наступны дзень заказваць новую (а гэта таксама, дарэчы, не бясплатна), запамінаць паролі і мяняць усё ў сваіх звыклых сістэмах анлайн-аплаты...

ЯК ЗАСЦЕРАГЧЫ СЯБЕ?

Служба падтрымкі рэсурсу «Куфар» размясціла на сайце вычарпальную інфармацыю аб махлярствах з карткамі — з ёй варта азнаёміцца ўсім, хто падае аб'явы. Рэкамендацыі па бяспецы даюць і іншыя рэсурсы. Падагульнім тое, што пішуць спецыялісты з нагоды стварэння бяспекі ад махлярстваў з банкаўскімі карткамі ў сеціве.

- Перапіску аб тавары вядзіце выключна ў чатах таго рэсурсу, дзе вы прадаяце альбо купляеце. Не сыходзьце ў месенджары або сацсеткі падчас стасункаў з патэнцыйным пакупніком ці прадаўцом. Сістэма бяспекі сур'ёзных рэсурсаў блакіруе спасылкі на фэйкавыя сайты (калі гаварыць пра «Куфар», адрасы «падробак» могуць быць такімі: Kufar.cc, Kufar.store, Kufarpay.site). А вось у месенджарах (Viber, Telegram, WhatsApp) або сацсетках вы самі адказваеце за бяспеку сваіх грашовых сродкаў. Калі «пакупнік» або «прадавец» з усіх сіл імкнецца перавесці стасункі з вамі з чата рэсурсу ў месенджар, гэта павінна стаць нагодай для сумненняў.
- Не сканіруйце QR-коды і не пераходзьце па спасылках, калі «пакупнік» або «прадавец» даслаў іх вам у Viber, Telegram, WhatsApp, сацыяльных сетках. Яны могуць выглядаць як спасылкі на «Куфар», «Белпошту», інтэрнэт-банкінг таго банка, паслугамі якога вы карыстаецеся. Увайдзіце на гэтыя рэсурсы праз афіцыйныя сайты, упісаўшы адрас сайта ў пошукавы радок уручную.
- Пры размяшчэнні аб'явы аб продажы свой нумар тэлефона лепш схаваць.
- Абавязкова пераканайцеся, што вы знаходзіцеся менавіта на патрэбным вам рэсурсе, а не на падробленым сайце. Бяспечней за ўсё заходзіць непасрэдна на рэсурс. У прыватнасці, на «Куфар» заходзьце па адрасе https://www.kufar.by або праз дадатак для Android і iOS. Заставайцеся на «Куфары» не толькі перапісваючыся з прадаўцом або пакупнікамі, але і заказваючы дастаўку тавару ці пераводзячы грошы на картку.
- Службы падтрымкі сур'ёзных рэсурсаў, дзе ажыццяўляецца купля і продаж тавараў або паслуг, не адпраўляюць паведамленні на Viber, Telegram, WhatsApp. На «Куфары» служба падтрымкі напіша вам на адрас электроннай пошты, якую вы ўказалі пры звароце. І ад службы падтрымкі ні ў якім выпадку не можа паступіць просьба паведаміць баланс карты або назваць поўныя даныя банкаўскай карткі.
- Заказ тавару з дастаўкай на «Куфары» зрабіць проста — дастаткова проста націснуць на кнопку «Купіць з дастаўкай» пад патрэбнай вам аб'явай. Аплачвайце тавар і дастаўку пры атрыманні пакупкі — кур'еру або ў аддзяленні пошты.
- Не пералічвайце перадаплату за тавар з падазрона нізкай цаной.

І самае галоўнае!

Нікому не паведамляйце:

- свае пашпартныя даныя;
- коды з СМС-паведамленняў банка ці рэсурсу, дзе вы ажыццяўляеце продаж або куплю;
- CVC/CV2-код — трохзначны код на адваротным баку банкаўскай карткі.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Крымінал

Хабар за праходжанне тэхагляду

Супрацоўнікамі па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі была выяўлена злачынная група, якая за грошы дапамагала незаконна атрымаць адзнаку аб праходжанні тэхагляду. У ходзе правядзення аператыўных мерапрыемстваў быў затрыманы 48-гадовы начальнік адной з дыягнастычных станцый Віцебска.

Як устанавілі аператыўнікі, мужчына атрымліваў грошы ад двух сваіх хаўруснікаў, якія бралі хабар ад аўтааматараў. Усяго падазраванаму перадалі такім чынам больш за 500 рублёў, паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама. Судом ён прыгавораны да чатырох гадоў пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму, а таксама з пазбаўленнем права займацца дзейнасцю, якая звязана з выкананнем арганізацыйна-распарадчых абавязкаў і правядзеннем юрыдычна значных дзеянняў на пяць гадоў.

Што датычыцца змоўшчыкаў, то яны таксама не сышлі ад адказнасці. Па артыкуле «Пасрэдніцтва ў хабарніцтве» ім прызначана пакаранне ў выглядзе абмежавання волі на тэрмін ад 1 года да 2,5 года. Прысуд уступіў у законную сілу.

Градкі з каноплямі ў лесе

У Ваўкавыскім раёне міліцыянеры затрымалі двух мясцовых жыхароў 31 і 32 гадоў, якія маюць дачыненне да незаконнага абароту наркотыкаў раслінага паходжання.

Як паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама, першапачаткова праваахоўнікі ўстанавілі месца, дзе раслі каноплі, і западозрылі, што яны выраслі там не самі. Тры акуратныя градкі ў лесе давалі зразумець, што за імі сочаць і чакаюць ураджаю.

Падазраваных затрымалі на рабоце. Абодва — будаўнікі, менавіта на аб'екце, як высветлілася, яны захоўвалі частку ўраджаю.

Усяго канфіскавана крыху больш за два грамы марыхуаны і каля чатырох кілаграмаў канопляў у сырым выглядзе. Са слоў мужчын, «траву» яны мелі намер выкарыстоўваць для ўласнага спажывання. Заведзена крымінальная справа.

Сяргей РАСОЛЬКА.

УТВЕРЖДЕНО
Решением единственного
Участника Общества
с ограниченной ответственностью
«ПриватКапитал»
от 05.10.2020 года
(Решение № 9)

ИЗМЕНЕНИЯ
в Проспект эмиссии облигаций второго выпуска
Общества с ограниченной ответственностью «ПриватКапитал»

1. Внести следующие изменения в Проспект эмиссии облигаций второго выпуска Общества с ограниченной ответственностью «ПриватКапитал» (далее по тексту – Проспект):

1.1. Пункт 1.2 Проспекта изложить в следующей редакции:

«Республика Беларусь, 223053, Минская область, Минский район, район деревни Боровая 1, главный корпус, кабинет 503/29-2, телефон +375(29)5005009, факс +375(17)3284528, e-mail: privat_office@mail.ru, официальный сайт: www.privatgroup.by (далее-сайт Эмитента).»

1.2. Подпункт 1.5.1 пункта 1.5 Проспекта изложить в следующей редакции:

«Эмитент в случаях и порядке, установленных законодательством Республики Беларусь, раскрывает информацию на рынке ценных бумаг:

путем ее размещения на Едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг (далее – Единый информационный ресурс);

путем ее размещения на сайте Эмитента, указанном в пункте 1.2 настоящего Проспекта эмиссии облигаций второго выпуска (далее – Проспект эмиссии);

либо путем ее доведения до сведения неопределенного круга лиц иным образом, определенным законодательством Республики Беларусь, а также путем ее представления в случаях, установленных законодательством Республики Беларусь, определенному кругу лиц.»

1.3. Подпункт 1.5.2 пункта 1.5 Проспекта изложить в следующей редакции:

«Эмитент, в соответствии с законодательством Республики Беларусь, раскрывает ежеквартальный отчет, содержащий бухгалтерский баланс и отчет о прибылях и убытках, не позднее тридцати пяти календарных дней после окончания отчетного квартала, а также годовой отчет, содержащий бухгалтерский баланс, отчет о прибылях и убытках и аудиторское заключение по бухгалтерской (финансовой) отчетности (за исключением случаев освобождения от обязательного аудита годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности), в срок не позднее 30 апреля года, следующего за отчетным, путем размещения на Едином информационном ресурсе, а также путем размещения на сайте Эмитента в глобальной компьютерной сети Интернет или на официальном сайте Республиканского унитарного предприятия «Республиканский центральный депозитарий ценных бумаг» (далее – Центральный депозитарий). Годовой (квартальный) отчет, размещенный на сайте Эмитента, должен быть доступен для обозрения всем заинтересованным лицам на постоянной основе до погашения второго выпуска облигаций.»

1.4. Подпункт 1.5.6 пункта 1.5 Проспекта изложить в следующей редакции:

«Эмитент раскрывает внесенные изменения и (или) дополнения в Проспект эмиссии путем их размещения на Едином информационном ресурсе и сайте Эмитента не позднее 5 (пяти) рабочих дней с даты их регистрации Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь (далее – Регистрирующий орган).»

1.5. Подпункт 1.5.7 пункта 1.5 Проспекта изложить в следующей редакции:

«Эмитент раскрывает информацию о приостановлении эмиссии облигаций второго выпуска не позднее двух рабочих дней, следующих за днем получения уведомления о приостановлении эмиссии облигаций второго выпуска, путем размещения на Едином информационном ресурсе и сайте Эмитента.»

1.6. Подпункт 1.5.8 пункта 1.5 Проспекта изложить в следующей редакции:

«Эмитент раскрывает информацию о возобновлении эмиссии облигаций второго выпуска не позднее двух рабочих дней, следующих за днем получения уведомления о возобновлении эмиссии облигаций второго выпуска, путем размещения на Едином информационном ресурсе и сайте Эмитента.»

1.7. Подпункт 1.5.9 пункта 1.5 Проспекта изложить в следующей редакции:

«Эмитент раскрывает информацию о запрещении эмиссии облигаций второго выпуска не позднее двух рабочих дней, следующих за днем получения уведомления о запрещении эмиссии облигаций второго выпуска, путем размещения на Едином информационном ресурсе и сайте Эмитента.»

1.8. Пункт 1.10 Проспекта изложить в следующей редакции:

«Полномочия единоличного исполнительного органа Эмитента переданы управляющей организации – обществу с ограниченной ответственностью «ПриватГрупп» (УНП 193472272, юридический адрес: г. Минск, пр-т Независимости, 79, каб.101) (далее – ООО «ПриватГрупп») (по договору передачи полномочий единоличного исполнительного органа Общества с ограниченной ответственностью «ПриватКапитал» управляющей организации Обществу с ограниченной ответственностью «ПриватГрупп» №1 от 01.10.2020 года). Директором ООО «ПриватГрупп» является Перов Дмитрий Владимирович. Занимаемые должности Перова Дмитрия Владимировича, в том числе вне органов управления Эмитента, в настоящее время: директор ООО «ПриватГрупп». Доля Перова Дмитрия Владимировича в уставном фонде Эмитента – 100 %.»

1.9. Пункт 1.11 Проспекта изложить в следующей редакции:

ФИО участника	Занимаемые в настоящее время должности, в том числе вне органов управления Эмитента	Размер доли в уставном фонде Эмитента, %
Перов Дмитрий Владимирович	Директор ООО «ПриватГрупп»	100

Контрольный орган не избирался.

1.10. Часть 1 подпункта 2.13.2 пункта 2.13 Проспекта изложить в следующей редакции:

«В случае принятия решения о досрочном погашении выпуска Облигаций (части выпуска Облигаций) Эмитент не позднее чем за 5 (Пять) рабочих дней до установленной Эмитентом даты досрочного погашения Облигаций уведомляет владельцев Облигаций посредством размещения соответствующей информации на сайте Эмитента о дате и количестве досрочно погашаемых Облигаций, а также раскрывает такую информацию на Едином информационном ресурсе.»

1.11. Часть 2 подпункта 2.13.2 пункта 2.13 Проспекта изложить в следующей редакции:

«Информация о дате формирования реестра владельцев Облигаций для целей досрочного погашения раскрывается Эмитентом не позднее 2 (двух) рабочих дней с даты принятия такого решения путем:

- размещения на Едином информационном ресурсе;
- размещения на сайте Эмитента.»

2. Остальные сведения, указанные в Проспекте, остаются без изменений.

Директор ООО «ПриватГрупп» (управляющей организации) Перов Дмитрий Владимирович

Директор ООО «ПриватГрупп» (организации, оказывающей ООО «ПриватКапитал» услуги по ведению бухгалтерского учета и составлению бухгалтерской и финансовой отчетности) Перов Дмитрий Владимирович

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ООО «Завод автомобильных прицепов и кузовов «МАЗ-Купава», г. Минск, ул. Машиностроителей, д. 18**
Предмет аукциона	
Административно-бытовой корпус № 2 с проходной (назначение: здание административно-хозяйственное, об. пл. 304,1 кв. м, 500/С-39010). Месторасположение: **г. Минск, ул. Машиностроителей, 18/1**	
Сведения о земельном участке: пл. **0,0656 га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 28.02.2025) для обслуживания здания административно-хозяйственного. Ограничения (обременения): охранные зоны сетей и сооружений теплоснабжения (пл. 0,0195 га)	
Начальная цена лота с НДС 20 % – 133 200,00 доллара США	
**Примечание: цена продажи Предмета аукциона фиксируется в протоколе о результатах аукциона в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долларах США по курсу НБРБ на дату проведения аукциона*	
Задаток в сумме 30 000,00 бел. руб. перечисляется на р/с BY60 BLBB 3012 0191 0213 9000 1001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»	
Срок подписания договора купли-продажи: 10 рабочих дней после проведения аукциона	
Условия оплаты предмета аукциона	
Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи	
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by	
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия	
Дата и время проведения аукциона: 16.12.2020 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 14.12.2020 до 17.00** по указанному адресу	

Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by

ОАО «Красный Октябрь»

извещает акционеров о проведении 17 ноября 2020 года в 11.00 внеочередного общего собрания по адресу: г. Витебск, проспект генерала Людникова, 10/3

Повестка дня

1. О направлении нераспределенной прибыли прошлых лет в централизованный фонд холдинга «Белорусская кожевенно-обувная компания «Марко».

С материалами по вопросам повестки дня акционеры могут ознакомиться в приемной Общества с 3 ноября 2020 года по 16 ноября 2020 года в рабочие дни (понедельник–пятница) с 8.30 до 12.00 и с 12.30 до 17.00 и 17 ноября 2020 года по месту проведения собрания.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, будет производиться в день проведения собрания с 10.00 до 10.45.

Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании, будет составлен на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного на 9 ноября 2020 года.

Для регистрации при себе необходимо иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Справки по тел. (80212) 52-55-70
Директор ОАО «Красный Октябрь».

УНП 300003144

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 24 ноября 2020 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего СЗАО «Белфарм»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)	**Изолированное помещение по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Карла Маркса, д. 108, общая площадь – 535,8 кв. м, инвентарный номер 200/D-99007**
Обременения	Ипотека
Продавец имущества	СЗАО «Белфарм», 220005, г. Минск, пр-т Независимости, 58, пом. 4, антресоль 1-й этажа, тел.: (029) 181-71-17
Организатор торгов	Государственное предприятие «МГЦН», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10, тел.: (017) 365-48-36
Начальная цена, с учетом НДС	616 170,00 доллара США
Размер задатка	80 000,00 бел. руб.
Условия торгов	Победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в белорусских рублях в размере, эквивалентном 1 проценту от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь на день проведения торгов

Торги проводятся в соответствии со статьями 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов по продаже имущества, принадлежащего СЗАО «Белфарм», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах от 13.11.2020.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Стоимость продаваемого имущества определяется в размере, эквивалентном наивысшей цене в долларах США, указанной в протоколе о результатах торгов, и подлежит оплате в белорусских рублях по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь на день перечисления денежных средств на счет продавца в соответствии с условиями договора купли-продажи предмета торгов, с учетом внесенной суммы задатка.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **24 ноября 2020 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 23.10.2020 по 20.11.2020 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); по осмотру имущества (029) 181-71-17 (СЗАО «Белфарм»).
Дополнительная информация размещена на сайте организатора торгов – www.mgcn.by.

ООО «Фрондера» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ЗАО «Ростэм»

Лот	Наименование	Местонахождение	Начальная цена без НДС, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона без НДС, бел. руб.
1	Доля в уставном фонде Общества с ограниченной ответственностью «Агрофирма Илья» в размере 100 %	Минская область, Вилейский р-н, д. Ободовцы	3 384 000,00	338 400,00	169 200,00

В отношении Лота проводятся третьи повторные торги. Ранее публикации размещались в газете «Звязда» № 145 (29259) от 29.07.2020, стр. 14.; № 175 от 09.09.2020, стр. 11, № 181 от 17.09.2020, стр. 15, № 193 от 03.10.2020 стр. 6

УСЛОВИЯ АУКЦИОНА И КРИТЕРИИ ВЫЯВЛЕНИЯ ПОБЕДИТЕЛЯ

Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Аукцион проводится до наиболее высокой цены предмета аукциона. Аукционист объявляет участника, предложившего более высокую цену за предмет аукциона, трижды повторяет последнюю цену и при отсутствии надбавок объявляет о том, что имущество считается проданным лицу, которое предложило на аукционе самую высокую цену.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Данный участник получает статус «Претендент на покупку» и на него распространяются правила и условия, установленные законодательством для победителя аукциона. Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, затрат на публикацию в течение 14 (четырнадцати) дней со дня проведения аукциона.

Оплата приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) производится в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона и затрат по размещению публикации в газете и на сайте bankrot.gov.by на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона.

Вознаграждение аукциониста – 1 % от конечной цены предмета торгов, складывающейся в ходе торгов.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

Начало приема заявлений в 10.00 23.10.2020 г. Окончание приема заявлений в 16.00 06.11.2020 г. по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121

Аукцион состоится 09.11.2020 в 12.00 (регистрация участников с 11.30 до 12.00) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте https://orgtorg.by

До подачи заявления необходимо внести задаток на **р/с BY36ALFA30122215570040270000** в Отделении «На Красной» ЗАО «Альфа-Банк», код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера». Назначение платежа: «задаток для участия в аукционе по продаже имущества ЗАО «Ростэм» (Лот №__), проводимом __.__.2020 г.». **Срок внесения задатка: с 10.00 23.10.2020 г. по 16.00 06.11.2020 г.**

Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей ценой.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра **+375 (44) 759-42-67, Михаловский Эдуард Михайлович**.

Дополнительная информация по предмету торгов по телефону **+375 29 308 28 97 (Анаида)**.

Организатор аукциона вправе после опубликования извещения о проведении аукциона отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.

Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».

Государственная регистрация договора купли-продажи, предприятия как имущественного комплекса и объектов недвижимости, входящих в его состав, осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет

Организатор аукциона	**ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by**
Продавец	**ЗАО «Ростэм» в лице антикризисного управляющего ООО «Центр финансового оздоровления «Партнер-Консультант» (220113, Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1118-11, тел. 8 (029) 365-06-97)**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

23 кастрычніка 2020 г. № 40 (576)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ЭКСПЕРТНАЯ ПЛЯЦОЎКА

Прапановы не са «столі»

У Магілёве абмеркавалі пытанні павышэння ролі мясцовага кіравання ў развіцці рэгіёнаў

Ці патрэбны Саветы дэпутатаў першага звяна, якое павінна быць фінансаванне ініцыятыў на мясцовым узроўні, што трэба для таго, каб павысіць аўтарытэт дэпутата сярод насельніцтва, якія падыходы неабходна выпрацаваць у выхаванні моладзі — гэтыя і іншыя пытанні падымаліся падчас дыскусіі. У ёй прынялі ўдзел прадстаўнікі выканаўчай і прадстаўнічай улады, органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, кіраўнікі прадпрыемстваў, грамадскіх аб'яднанняў. На працягу амаль трох гадзін ішло дынамічнае абмеркаванне прапаноў, якія будуць абагульнены і перададзены для разгляду на рэспубліканскі ўзровень.

— Сёння ў парламент актыўна паступаюць прапановы аб тым, што трэба змяніць у нашым заканадаўстве, у тым ліку і ад прадстаўнікоў, як я называю, канструктыўнай апазіцыі, — адзначыла **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Святлана ШУТАВА.** — Радуе, што людзей, нягледзячы на розныя погляды і пераканні, аб'ядноўвае жаданне зрабіць жыццё як мага лепшым. Паступаюць прапановы па перазмеркаванні паўнамоцтваў Прэзідэнта, парламента, урада, мясцовых органаў улады, наконт рэфармавання судовай сістэмы. Збор прапаноў і пытанняў працягваецца да 29 кастрычніка. Яны датычацца не толькі нашага Асноўнага закона, там ёсць пытанні адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення, мясцовага самакіравання.

— Палата прадстаўнікоў павінна сістэматызаваць і паведамляць праз СМІ, якія прапановы паступаюць у парламент, — заўважыў **старшыня пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Анатоль ГЛАЗ.** — Каб потым ніхто не сказаў, што гэтыя прапановы ўзятыя са столі.

Перад сустрэчай у Магілёве Анатоль Глаз прыняў удзел у абмеркаванні пытанняў мясцовага самакіравання ў Бабруйску.

— Там гучалі прапановы па скасаванні Саветаў першічнага ўзроўню, і я іх падтрымаў, — паведаміў дэпутат. — Сельсаветы ў частцы дэпутацкага корпуса трэба выключаць як непрацуючыя — гэта відавочны фармалізм. Бо Савет і выканкам на вёсцы — гэта па сутнасці адно і тое ж. Калі чалавеку трэба, ён звернецца ў выканкам. Па сутнасці, сельскі Савет дэпутатаў сёння не можа вырашыць ніводнай сур'ёзнай задачы. Па-першае, дэпутацкаму корпусу ў плане адстойвання інтарэсаў мясцовай тэрыторыі не хапае актыўнасці. Па-другое, каб нешта рабіць, трэба мець фінансы, а іх у адміністрацыі сельсавета няма. Трэба шэраг падаткаў пакідаць у раёнах, каб на месцах маглі нешта рашаць.

Пры абмеркаванні эфектыўнасці мясцовага самакіравання **старшыня камітэта эканомікі Магілёўскага аблвыканкама Дзмітрый МУДРАГЕЛАЎ** адзначыў, што, разглядаць яго ролю без прывязкі да выканаўчай улады, без уліку меркавання рэгіянальных улад немагчыма.

Спікеры дыскусійнай пляцоўкі Святлана ШУТАВА і Анатоль ГЛАЗ.

— Немагчыма іх падзяліць з пункту гледжання і фінансавання, і развіцця рэгіёна. Калі мы кажам пра мясцовае самакіраванне, павінны разумець — эфектыўнасць выяўляецца найперш у росце дабрабыту грамадзян, якія жывуць на азначанай тэрыторыі. А рост без эканамічнага складніка немагчымы.

Першы намеснік старшыні Магілёўскага гарвыканкама Аляксандр ПАЦЁМКІН пераканаўся, што без фінансавання нічога зрабіць немагчыма. Ён закрануў тэму падаткаў.

— У кансалідаваным бюджэце няма падатку на прыбытак. Працуе прадпрыемства на тэрыторыі горада з прыбыткам або не, для Магілёва не мае ніякай розніцы, — канстатаваў ён. — На дабрабыце насельніцтва гэта ніяк не адбіваецца. Калі мы пераключымся з выканання паказчыкаў на дабрабыт людзей, калі будзе праведзена адзіная палітыка ў гэтым кірунку, тады можна будзе спытаць і з мэра, і з яго намеснікаў. А пакуль у нас то «недафінансавалі», то яшчэ што. Ёсць уся заканадаўчая база, трэба разабрацца з фінансаваннем.

стар. 2

МЯСЦОВЫ ЧАС

СПАЛУЧЫЦЬ СУЧАСНАЕ З ГІСТАРЫЧНЫМ

Былы райцэнтр Шарашэва чакае грунтоўнага добраўпарадкавання

Многія былыя райцэнтры Брэстчыны апошнім часам прыкметна змянілі сваё аблічча да лепшага. Найбольш гэтаму паспрыяў сацыяльны праект пад назвай «Дажынкі». Планамерна выдзяліліся сродкі, праводзілася добраўпарадкаванне, паляпшалася інфраструктура населеных пунктаў. Толькі за апошнія тры гады на Брэстчыне істотна папрыгажэлі Высокае Камянецкага раёна, Ружаны — Пружанскага, зусім нядаўна расквітнеў Дзівін на Кобрыншчыне. Шарашэву ў гэтым сэнсе не пашанцавала, «Дажынак» тут не праводзілі. Але ёсць іншыя нагоды для паляпшэння знешняга выгляду былога мястэчка.

стар. 3

Цэнтральная плошча.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Хвалюе лёс краіны

Людзі дэманструюць высокі ўзровень адказнасці за лёс сваёй краіны, — зрабіў выснову па выніках асабістага прыёму грамадзян старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ.

Падчас размовы наведвальнікі выказвалі таксама і прапановы па канстытуцыйнай рэформе.

Сяргей Сівец адзначыў, што дыялогавыя пляцоўкі, якія праводзяцца паўсюдна, прыкметна актывізавалі значную частку грамадства, выклікалі жаданне ўдзельнічаць у перафармаціраванні палітычнай сістэмы краіны і яе дзяржаўных інстытутаў. Паводле слоў сенатара, увогуле правядзенне дыялогавых пляцовак дае магчымасць грамадзянам удзельнічаць у дыскусіі разам з экспертамі, канструктыўна падыходзіць да абмеркавання актуальных пытанняў.

Не толькі кваліфікацыя

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ сустрэўся са слухачамі спецыяльнасці «Міжнародныя адносіны» Інстытута дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Сенатар акцэнтаваў увагу на паўнамоцтвах Савета Рэспублікі ў рэалізацыі розных аспектаў знешняй палітыкі Беларусі. Ён, у прыватнасці, адзначыў, што адным з асноўных кірункаў дзейнасці верхняй палаты парламента з'яўляецца ратыфікацыя і дэнансацыя міжнародных дагавораў. Апошнім часам ратыфікуецца вялікі аб'ём дакументаў, якія дазваляюць пашыраць і паглыбляць міжнароднае супрацоўніцтва па розных кірунках. Напрыклад, на працягу шостага склікання Нацыянальным сходам было ратыфікавана 162 міжнародныя дагаворы, за першыя дзве сесіі сёмага склікання — 37.

Сяргей Рачкоў адзначыў таксама, што сёння работніку ў сферы міжнародных адносін ужо недастаткова быць кваліфікаваным спецыялістам, важна быць адданым сваёй краіне, абараняць беларускую дзяржаўнасць.

Значэнне псіхалагічнага мікраклімату

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ наведала Мінскі гадзіннікавы завод. Сенатар азнаёмілася з тэхналагічнымі асаблівасцямі гадзіннікавай вытворчасці, а таксама сустрэлася з працоўным калектывам прадпрыемства і адказала на актуальныя пытанні.

Таццяна Рунец адзначыла, што ў сучасных умовах важнае значэнне мае фарміраванне спрыяльнага псіхалагічнага мікраклімату ў працоўным калектыве і згуртаваная камандная работа. Тут мэтазгодна ўкараняць пазітыўны досвед паспяховых кампаній, арыентаваць калектыў на сумесную актыўную дзейнасць для дасягнення агульнай мэты.

У гутарцы з кіраўніцтвам прадпрыемства сенатар падкрэсліла, што сёння асаблівую ўвагу трэба аддаваць ідэалагічнай і растлумачальнай рабоце.

Унікальны аб'ект у Салігорску

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, генеральны дырэктар ААТ «Беларуськалій» Іван ГАЛАВАТЫ выступіў куратарам будаўніцтва ў Салігорску ўнікальнага для Беларусі і краін СНД парабалічнага ролер-трэка. Аналагічныя трэкі ёсць толькі ў Паўднёвай Карэі і Калумбіі. Салігорская арэна — трэцяя ў свеце.

Днямі горад упершыню прыняў рэспубліканскія спаборніцтвы па ролер-спорце, якія прайшлі на новым трэку. У Салігорск прыехалі прафесійныя спартсмены розных узростаў. Самаму юнаму — пяць гадоў. На дарожку ролер-трэка выйшлі члены нацыянальнай зборнай Беларусі па канькабежным спорце. Спартсмены спаборнічалі ў спідскейцінгу і фрыстайл-слаламе. Арганізавалі забегі для аматараў.

У час спаборніцтваў было абвешчана, што ў Салігорску ў хуткім часе плануецца адкрыць ролер-школу для прафесійнай падрыхтоўкі спартсменаў.

Прапановы не са «столі»

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Гораду павышаць дабрабыт насельніцтва лягчэй, — адзначыў Дзмітрый Мудрагелаў. — Тут знаходзяцца валаўтваральныя прадпрыемствы і бізнес лепш развіты. Раўнамернае развіццё тэрыторыі — гэта адна з мэт на найбліжэйшую пяцігодку. Асаблівая ўвага паўднёва-ўсходняму рэгіёну, у які ўключаны сем раёнаў Магілёўскай вобласці, асобная ўвага ўдзяляецца гарадам 80+, куды ўваходзіць Бабруйск.

Святлана СМОЛІКАВА, намеснік старшыні Касцюковіцкага раённага выканаўчага камітэта па эканамічных пытаннях, адзначыла, што за пяць апошніх гадоў, дзякуючы 235-му Указу, у раён прыцягнута 26 мільёнаў рублёў інвестыцый. А гэта новыя рабочыя месцы і развіццё раёна. На яе думку, указы 235 і 177 дапамогуць затрымаць людзей у малых гарадах.

Святлана ЯЗЕРСКАЯ, старшыня Слаўгарадскага райсавета, падзялілася думкамі, якія былі агучаны на дыскусійнай пляцоўцы ў горадзе.

— Жыхароў нашага раёна хвалюе шырокі спектр пытанняў — ад працаўладкавання спецыялістаў на вёсцы да электрыфікацыі населеных пунктаў для ацяплення жылых дамоў. Раёны, якія пацярпелі ад Чарнобыльскай аварыі, у тым ліку Слаўгарадскі, у гэты спіс не ўвайшлі з улікам газіфікацыі, але ж не ва ўсіх населеных пунктаў яна праведзена.

Максім ГУРЫН звярнуў увагу на неабходнасць растлумачыць, як рэалізаваць паўнамоцтвы.

Старшыня Магілёўскага абкама прафсаюзаў АПК Генадзь ЧОРНЫ выказаўся наконт перагляду падатковай сістэмы.

— Цэлы шэраг падаткаў трэба пакідаць у раёнах і вызваліць ад іх інвестараў, якія працуюць на перыферыі, — перакананы ён. — І чым гэтыя населеныя пункты далей ад райцэнтраў, тым менш павінна быць падаткаў. Трэба вар'іраваць. А то ўсе інвестары цяпер засяроджаны або ў сталіцы, або ў абласных цэнтрах.

Падчас абмеркавання тэмы, ці хапае дэпутату паўнамоцтваў для таго каб дайсці да кожнага чалавека, і што неабходна, каб павысіць узровень дэпутацкай работы, **старшыня Магілёўскага гарсавета дэпутатаў Максім ГУРЫН** адзначыў:

— Для рэалізацыі паўнамоцтваў ёсць усе інструменты, не хапае толькі фінансаў. Асабліва, калі трэба вырашыць нейкія глабальныя пытанні. Калі казаць пра закон аб мясцовым кіраванні і самакіраванні, там шмат гаворыцца пра тое, як яно створана і функцыянуе, але няма тлумачэння, як рэалізаваць паўнамоцтвы, асабліва маленькаму савету тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. Магчыма, ім трэба прыдаць статус юрыдычнай асобы? Не прапісана фінансаванне. Дастаткова вялікая забюракратызаванасць выбарчага працэсу ў гэтыя органы самакіравання. Сёння Саветы дэпутатаў маюць больш стратэгічнае значэнне, яны прымаюць рэгіянальныя праграмы, мясцовы бюджэт, але вырашэнне пытанняў штодзённага працэсу жыццядзейнасці нашага насельніцтва — гэта ўжо поўная кампетэнцыя органаў выканаўчай улады.

Святлана ШУТАВА адзначыла, што паступае шмат канструктыўных прапаноў.

Гучалі таксама прапановы прааналізаваць школьныя падручнікі на прадмет выхавання патрыятызму. Як адзначалі некаторыя настаўнікі, у геаметрычнай прагрэсіі памяншаецца колькасць гадзін па гісторыі Беларусі і, у прыватнасці, адведзеных на вывучэнне тэмы Вялікай Айчыннай вайны. Удзельнікі дыскусіі выказваліся адназначна: трэба нешта мяняць, каб моладзь мела магчымасць ганарыцца сваімі продкамі і званнем народа пераможцаў.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота аўтара.

ДЭПУТАЦКІЯ КЛОПАТЫ

ТЭРЫТОРЫЯ АДКАЗНАСЦІ

Пра восеньскія клопаты мясцовай улады карэспандэнт «МС» пагутарыў са старшынёй Маладзечанскага раённага Савета дэпутатаў Андрэем ПАЎКШТАМ.

— Андрэй Анатолевіч, у краіне распачаўся ацяпляльны сезон — падзея чаканая і традыцыйная, тым не менш яго старт рэдка абыходзіцца без непрыемных сюрпрызаў. Што робіцца ў раёне, каб іх было менш?

— Падрыхтоўку да яго мы заўсёды вядзём сумесна з райвыканкамам. У зоне яго адказнасці — спецыяльная тэхніка, навясное абсталяванне, пляцоўкі для ўтылізацыі снегу, таксама стварэнне аварыйных брыгад, назапашванне ў дастатковым аб'ёме сумесяў для апрацоўкі вуліц і дарог. Увогуле ўсе арганізацыі і службы горада і раёна гатовыя да ацяпляльнага сезона. Пашпарты гатоўнасці атрымалі ўстановы сацыяльнага прызначэння, аховы здароўя, адукацыі, культуры, спорту.

У раённага Савета і яго дэпутатаў і сваё кола клопатаў і абавязкаў, і свая спецыфіка падрыхтоўкі да зімовага перыяду. У нашым раёне 13 сельсаветаў, там, дзе ёсць кацельныя, усе яны маюць адпаведны дазвол на падачу свайм насельнікам цеплавой энергіі. Адна з галоўных задач сельскіх Саветаў — забеспячэнне вясковых жыхароў, жыллё якіх не газіфікавана, палівам. Гэта пераважна дровы і брыкет. На асабліваым уліку шматдзетныя сем'і, адзінокія пажылыя і нярэдка сур'ёзна хворыя людзі. Сёлета больш чым 50 такім жыхарам мы ў рамках дабрачыннай акцыі завезлі па машыне дроў.

— На жаль, рэдкі ацяпляльны сезон абыходзіцца без вясковых пажараў. Як звесці да мінімуму гэту сумную статыстыку?

— Важная роля ў папярэджванні пажараў па-ранейшаму належыць аглядным камісіям сельсаветаў. Іх дзейнасць сёлета вясной і ў пачатку лета была прыпынена з-за пандэміі. Але апошнім часам і асабліва ў перыяд падрыхтоўкі да зімы камісіі зноў аднавілі сваю работу. І вельмі дарэчы. Бо ўдалося выявіць у асобных дамах істотныя недахопы ва ўтрыманні жылля, якія пры збегу непажаданых абставін могуць прывесці да трагедыі.

Члены камісій не ў сілах абысці кожны падворак на тэрыторыі іх сельсавета. Наведваем звычайна тых, хто выклікае наш пэўны інтарэс праз абыякавае стаўленне да выканання папярэдніх заўваг. Скажам, праігнараваны ранейшае патрабаванне рамонту печкі, іншыя слушныя рэкамендацыі спецыялістаў. Такіх, мякка кажучы, абыякавых да свайго жылля, здароўя і, нарэшце, жыцця, члены камісіі наведваюць нават па некалькі разоў штогод. Галоўнае — не дапусціць бяды.

— Зіму адзінокаму пажылому чалавеку перажыць у вёсцы часам вельмі складана. У цяжкую задачу ператвараецца спроба прынесці вядро вады з калодзежа, прапаліць печку, адкінуць снег ад ганка, схадзіць да аўталаўкі. Чым дапамагаеце такім вяскоўцам?

— У раёне ўжо не першы год існуе практыка арганізацыі сумеснага пражывання адзінокіх людзей саліднага ўзросту. Такі цэнтр працуе ў Сасновым Бары. У аграгарадку Гарадок ёсць бальніца сястрынскага догляду, дзе пад наглядам медыкаў старыя могуць перазімаваць у нармальных умовах.

— А работа па добраўпарадкаванні таксама працягваецца?

— Яна ніколі не заканчваецца. Хацелася б, каб жыхары ўсіх сельсаветаў, а таксама размешчаныя на іх тэрыторыі арганізацыі і прадпрыемствы ўдзельнічалі ў добраўпарадкаванні сваіх населеных пунктаў. Гэта не толькі работа па азеляненні, пасадка дрэў або кустоў, афармленне кветнікаў. Вітаецца райсаветам, напрыклад, правядзенне суботнікаў, экалагічных акцый, скажам, па ліквідацыі стыхійных звалак смецця, уладкаванне дзіцячых пляцовак, рамонт агароджаў і іншыя мерапрыемствы па навядзенні парадку і добраўпарадкаванні тэрыторый двароў. Зразумела, у зоне пастаяннай увагі сельсаветаў знаходзяцца мемарыяльныя комплексы, мясціны баявой і воінскай славы.

— Не новая праблема, але ад гэтага не менш актуальная — знос кінутых, пустых і старых дамоў. Як вы яе вырашаеце ў раёне, скажам, у рамках кампаніі па навядзенні парадку на зямлі?

— Сапраўды, пытанне не з прыемных. І што цікава, калі пачынаем разбірацца з кожным такім домам — кандыдатам на ліквідацыю, то даволі часта высвятляецца, што ў яго недзе ёсць уладальнік, які, на жаль, не праяўляе

glubinka.by

аніякай цікаўнасці да спадчыны. Імкнёмся адшукаць гаспадара, паўплываць на яго, каб нейкім чынам праявіў клопат пра дзедаўскую сядзібу. А калі не атрымліваецца знайсці ўладальніка, а набыць хату праз аўкцыён няма ахвотных, тады адзін шлях — знос з наступнай утылізацыяй адходаў. Між іншым, нятанная справа. Таму імкнёмся прымеркаваць знос старога дома да суботніка, пэўныя рэшткі аддаём людзям на дровы, а шыфер, рубероід вывозім на сметнік.

Сёлета ўжо знеслі 19 такіх нічыйных дамоў. На падыходзе яшчэ некалькі. Спачату чатыры з іх выставім на аўкцыён. Дзейнічаем абавязкова ў прававым полі, каб потым не ўзнікала да нас пытанняў.

— Ролю вашых памочнікаў — старастаў вёсак — цяжка пераацаніць. Хто яны?

— Большасць старастаў вёсак нашага раёна — людзі сталага ўзросту. І гэта нармальна. Каб адпавядаць статусу старасты, чалавек павінен валодаць вялікім жыццёвым досведам, ведаць людзей, зарэкамендаваць сябе ў працы, грамадскім жыцці, пава-жаць мясцовыя традыцыі і звычаі. Тады яму будуць даваряць і больш прыслухоўвацца, раіцца з ім. Як, напрыклад, стараста з вёскі Груздава Ніна Аляксандраўна Станевіч. Па выніках конкурсу Мінскага абласнога Саветаў дэпутатаў сярод сельскіх, пасялковых, гарадскіх (гарадоў раённага падпарадкавання) Саветаў дэпутатаў, органаў грамадскага тэрытарыяльнага самакіравання па вырашэнні пытанняў выццезабеспячэння насельніцтва ў свой час Ніна Аляксандраўна заняла 2-е месца ў вобласці і была ўзнагароджана дыпломам і грашовай прэміяй.

Са свайго боку мясцовая ўлада раёна таксама імкнецца падтрымліваць старастаў маральна і матэрыяльна. Мы не забываем пра іх і пры падвядзенні вынікаў года сярод найлепшых па прафесіі ў раёне: для іх ёсць спецыяльная намінацыя «Найлепшы стараста грамадскага тэрытарыяльнага самакіравання». Пераможцы ўзнагароджваюцца граматай і прэміяй. І як найлепшыя працаўнікі заносяцца на раённую дошку гонару.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

БЕЛАРУС ДАСЛЕДАВАЎ БАЙКАЛ

Новы фільм з цыкла «100 імён Беларусі» пад назвай «Бенядзікт Дыбоўскі. Таямніцы свяшчэннага мора» выйдзе ў нядзелю 1 лістапада ў эфіры тэлеканала «Беларусь 3».

Дакументальная кінастужка ад рэжысёра Тараса Вашчанкі раскажа пра даследчыка з цікавым лёсам, які пакінуў свой след у гісторыі адкрыццяў....

Складана паверыць, але ўсяго толькі 150 гадоў таму найбуйнейшае возера планеты лічылася практычна незаселеным. Вучоныя ў адзін голас сцвярджалі, што акрамя омуля ды яшчэ некалькіх біялагічных відаў там ніякага жыцця не існуе, а значыць, і даследаваць няма чаго. Аднак некалькі ссыльных з беларускіх зямель ім не паверылі і ўсё ж пачалі свае пошукі.

Бенядзікт Дыбоўскі нарадзіўся за шэсць тысяч кіламетраў ад Байкала — у Беларусі (у маёнтку Адамарын непадалёк ад Маладзечна). Атрымаў выдатную адукацыю, зрабіў кар'еру, — паколькі ўжо амаль у трыццацігадовым узросце быў прафесарам заалогіі Варшаўскага ўніверсітэта, едзіў з экспедыцыямі па ўсім свеце, меў узнагароды ды прызнанне ў навуковых колах і добрую перспектыву. Але калі ў 1863 годзе пачалося паўстанне супраць царскага самадзяржаўя, то ён не змог застацца ўбаку. Вынік — арышт, суд і прыгавор — смяротная кара...

На шчасце, па хадайніцтве самога Ота фон Бісмарка той прысуд замянілі на катаргу. Тады здавалася, што на навуковай кар'еры можна ставіць крыж, бо ў суровых сібірскіх умовах толькі б пашчасціла выжыць. Аднак, нават апынуўшыся на лесапавале, Дыбоўскі працягваў займацца навукай. Дзякуючы яму і яго сябрам, якія займаліся вывучэннем Байкала і яго навакольля, свет наноў змог адкрыць гэтае свяшчэннае мора. Вучоны апісаў шмат новых, нават невядомых дагэтуль навуцы рачкоў, адкрыў галамянку і іншую жыўнасць возера...

Сам фільм зроблены ў стылістыцы чорна-белага кіно з інтэрцітрамі для перыяду жыцця Дыбоўскага, калі ён быў у ссылцы, і ў колеры для паказу дзён, дзе вучоны расказвае пра сваё мінулае жонцы. Але, як адзначаў сцэнарыст Барыс Герстэн, у стужку не трапіла шмат чаго, што можна расказаць пра гэтага чалавека. А значыць, у гледача будзе нагода для асабістых даследаванняў пасля альбо напярэдадні прагляду.

Алена ДРАПКО.

ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 125

З 5 да 11 кастрычніка адбыўся чэмпіянат Беларусі па шашках-100 сярод мужчын і жанчын (першая ліга). Спаборніцтвы прайшлі па швейцарскай сістэме ў 9 тураў пры 24 удзельніках у мужчын і 19 удзельніцах у жаночым турніры. Па чатыры найлепшыя адабраліся ў вышэйшыя лігі наступнага года. Пуцеўкі атрымалі Ігар Цярэшка, Яўген Жукоўскі, Алег Чэпа, Юрый Цімановіч у мужчын і Дар'я Нікіфарава, Анастасія Барышава, Яўгенія Швед, Любоў Кобрына ў жанчын.

Паглядзіце цікавыя прыклады гульні.

№ 108 Д. Лапчук — І. Цярэшка

Белыя простыя шашкі: 22, 25, 27, 30, 31, 32, 33, 35, 36, 37, 38, 39, 40, 42, 43, 48, 50 (17)

Чорныя простыя шашкі: 2, 3, 4, 6, 8, 10, 11, 12, 13, 14, 16, 18, 19, 23, 24, 26, 29 (17)

Белыя правялі камбінацыю і трапілі ў дамкі. Знайдзіце яе і аціміце наступствы.

№ 109 Ю. Цімановіч — Я. Капусцін

Белыя простыя шашкі: 28, 31, 32, 33, 34, 38, 39, 40, 41, 42, 43, 44, 45, 47, 48, 49 (16)

Чорныя простыя шашкі 1, 2, 3, 5, 6, 8, 9, 10, 11, 13, 15, 18, 19, 20, 21, 23 (16)

Белыя неасцярожна напалі на шашку саперніка 1.3126? Чорныя адказалі ўдарам «пачаткоўца». Пакажыце яго.

№ 110 А. Спірына — А. Немец

Белыя простыя шашкі: 28, 31, 33, 34, 40, 36, 47, 49 (8)

Чорныя простыя шашкі 2, 3, 6, 10, 17, 19, 21, 24 (8)

Белыя згулялі 1. 3126, справакаваўшы саперніцу паставіць «кала» 1...2127? На што рушыла ўслед камбінацыя. Знайдзіце яе.

У канцы верасня на 73-м годзе пайшоў з жыцця Пётр Арцёмавіч Кавалёў — майстар спорту, вядомы шашачны складальнік. Яго шашачныя творы публікаваліся і ў нашым аддзеле. Сённяшнія кампазіцыі прысвячаюцца пямяці П. Кавалёва.

№ 111

У канцы гэтага месяца ў рабочым пасёлку Бальшавік плануецца ўвесці ў эксплуатацыю 60-кватэрны жылы дом з аўтаномнай электракацельняй. У адрозненні ад традыцыйных «панэлек» у ім для ацяплення кватэр, падагрэву вады і прыгатавання ежы будзе выкарыстоўвацца толькі электрычнасць.

Фота Марыны ВАСІЛЬЕВАЙ.

— Жылы дом з аўтаномнай электракацельняй у Бальшавіку стане першым шматкватэрным жыллём у такім выкананні ў Гомельскай вобласці, — адзначыў **дырэктар УКБ Гомельскага раёна Вячаслаў ТАКАРЭЎСКІ.** — У падвальным памяшканні панэльнага дома ўстаноўлены два катлы для ацяплення і адзін — для падагрэву вады. Гэта дазволіла пры будаўніцтве пазбавіцца неабходнасці ўстаноўкі ў кожнай кватэры электракатлоў і бойлераў. Акрамя таго, на кожнай кухні размешчаны электраплиты.

Па словах спецыяліста, відавочны плюс дамоў такога тыпу заключаецца ў тым, што да іх не трэба пракладваць цеплатрасы і газаправод. Трансфарматарная падстанцыя знаходзіцца непасрэдна ў дварэ новабудоўлі, а да яе падведзена лінія электраперадачы, адкуль ідзе разводка да электрашчыткоў.

Як вядома, будаўніцтва падобных жылых дамоў вядзецца з мэтай выкарыстання рэсурсаў беларускай атамнай электрастанцыі. З уводам БелАЭС і павелічэннем выпрацоўкі электраэнергіі ў рэгіёне таксама плануецца пашырыць колькасць жыллёвых аб'ектаў і аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры, якія цалкам абслугоўваюцца з дапамогай электрычнасці.

— Гэты кірунак адназначна будзе развівацца. У найбліжэйшых планах нашага прадпрыемства — будаўніцтва мікрараёна жылой забудовы на тэрыторыі Чонкаўскага сельсавета, — дадаў Вячаслаў Такарэўскі. — Так, у населеным пункце Сеўрукі праз два гады пачнецца маштабнае ўзвядзенне дзвюх шматкватэрных забудоў агульнай жылой плошчай больш як 55 тысяч квадратных метраў. А гэта дзве з паловай тысячы кватэр з выкарыстаннем электрычнай энергіі.

Сёння на месцы будучага мікрараёна вядуцца падрыхтоўчыя работы. Акрамя таго, прадпрыемства «Гомельэнерга» распрацоўвае праектна-каштарысную дакументацыю на будаўніцтва падстанцыі «Паўднёвая», з якой у мікрараён будзе падавацца электраэнергія.

Між тым, налета ў пасёлку Бальшавік пачнецца будаўніцтва яшчэ аднаго жылога дома з электракацельняй. Гэта будзе будынак з цэглы на 40 кватэр.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Жыць з камфортам

Як на Віцебшчыне рэалізуецца дзяржаўная праграма па стварэнні ўмоў для камфортнага жылля і спрыяльнага асяроддзя? Тэму нядаўна абмяркоўвалі ў аблвыканкаме.

Праблемы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, як той казаў, з барадой: назапашваліся дзясяткі гадоў. Таму ці варта здзіўляцца, што менавіта пра іх расказваюць часцей за ўсё заяўнікі, якія тэлефануюць на прамыя лініі, пішуць лісты ў райвыканкамы, гарвыканкамы, у абласныя і рэспубліканскія органы ўлады, Камітэт дзяржкантролю і гэтак далей.

Бадай, у першую чаргу тых, хто жыве ў шматкватэрных дамах, якія пабудавалі дастаткова даўно, цікавіць пытанне рамонту.

У Віцебскай вобласці адпаведнае заданне на гэты год — 515 тысяч квадратных метраў. Прагназуецца, што нададуць «другое жыццё» жыллю плошчай 470 тысяч... Канешне, не сакрэт, што з году ў год фінансаў на рамонт не хапае. Як не аднойчы адказвалі незадаволеным грамадзянам кіраўнікі розных жыллёва-камунальных арганізацый: «Былі б грошы, даўно б усё адрамантавалі...»

У сувязі са зменамі ў заканадаўстве цяпер жыльцы павінны ўдзельнічаць у сумесным фінансаванні, у прыватнасці, гэта датычыцца ўцяплення сцен. Безумоўна, пры гэтым ніхто не збіраецца адбіраць апошні рубель. І необходнасць таго ж «футра» для сцен дома абмяркоўваецца ўсімі жыльцамі. Ім прапануюцца і вельмі прымальныя праграмы выплат у растэрміноўку.

На капітальны рамонт сёлета накіравана толькі з мясцовых бюджэтаў 7,6 мільёна рублёў, а ўсяго 17,8 мільёна. У так званыя графікі рамонту жыллёвага фонду ўключана каля 260 аб'ектаў. У тым ліку прадугледжваўся капітальны рамонт для прыблізна 170. І ў параўнанні з мінулым годам, гэта менш на 29 %. На сёння ў 48 дамах работы ўжо завершаны, у 92 — вядуцца...

А вось праграма па замене ліфтаў фінансуецца ў поўным аб'ёме. На бяспеку, зразумела, вылучаць грошы трэба ў першую чаргу. У першым паўгоддзі неабходна было ўстанавіць 48 новых ліфтаў, а замянілі 68. На гэтыя мэты накіравалі 10,5 мільёна рублёў.

Праграма «Чыстая вада» на поўначы Беларусі рэалізуецца даволі паспяхова. На працягу пяцігодкі планавалі пабудаваць не менш за 240 станцый па ачыстцы вады. З 2016 да 2019 года на 10,4 % павялічылася забеспячэнне якаснай вадой спажыўцоў — усяго да 94,8 %.

Сёлета ў выніку выканання праграмы гэты паказчык дасягне 96,3 %. Якаснай вадой будуць карыстацца каля 12 тысяч жыхароў глыбінкі, у асноўным у аграгарадках.

Сёлета на рэалізацыю мерапрыемстваў дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы прадугледжана добрае фінансаванне — 8,4 мільёна рублёў, у тым ліку са сродкаў рэспубліканскага бюджэту — 4,2 мільёна і столькі ж — з абласной казны.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

СЕЛЬСКІ ТУРЫЗМ

ПАЧЫНАЕШ ЦАНІЦЬ СВАЁ, КАЛІ ЗАМЕЖНАЕ НЕДАСТУПНА

Як жыве аграсядзіба «У Пятровіча» падчас пандэміі каранавіруса

АГРАСЯДЗІБА знаходзіцца непадалёк ад Мінска, у вёсцы Серафімова, што на тэрыторыі Міханавіцкага сельсавета. Мне здавалася, што Пятровіч — чалавек такога сталага веку. Але сустрэў мужчына, якому на выгляд крыху больш за трыццаць.

— Мы працуем з 2005 года. Купілі тут дом для пражывання. Але палічылі, што ён занадта вялікі, таму вырашылі заняцца агратурызмам. Усё рабілі сваімі рукамі разам з сям'ёй. У выніку ў нас уладкавана банкетная зала на 45 месцаў з магутнай акустычнай сістэмай, зонай для танцаў, святламузыкай. Абсталяваны дзіцячы пакой. Пакуль мамы і таты весяляцца, малыя глядзяць мульцікі, забаўляюцца пад наглядам дарослых, — кажа Максім Аўчынікаў.

Для аматараў фінскай лазні таксама створаны камфортныя ўмовы. Пасля парылкі яны могуць адпачыць, папіць гарбаты ці квасу, паслухаць музыку. Для тых, хто аддае перавагу адпачынку на свежым паветры, устаноўлены альтанкі, мангал для шашлыкоў. Тут жа —дзіцячыя пляцоўкі, абсталяваныя рознымі атракцыёнамі. А вось і невялікая сажалка з пераходным масткам, дзе можна пастаяць, атрымліваючы асалоду ад ціхага цурчання вады.

На тэрыторыі сядзібы растуць яблыні і чарэшні, якія наведвальнікі могуць зрываць і есці, чым ахвотна карыстаюцца. У планах — зрабіць вялікі басейн, вадаём з падагрэвам, дзе можна будзе купацца нават зімой, і яшчэ адну лазню з гасцявым домікам.

— Што змянілася ў вашай рабоце ў сувязі з пандэміяй каранавіруса, ці выраслі цэны на паслугі? — пацікавілася ў свайго суразмоўніка.

— Працуем, так бы мовіць, на дагаворнай аснове, ідзём насустрач пажаданням нашых гасцей. У будныя дні зніжаем кошт адпачынку. Ды і наогул, дамаўляемся з кліентамі наконт цэн на паслугі. Напрыклад, прапаноўваем розныя варыянты пры арганізацыі банкетаў, карпаратыўных мерапрыемстваў. Людзі могуць даставіць свае прадукты, а нашы кухары аграворваюць з імі меню. Некаторыя наогул рыносяць стравы, прыгатаваныя дома. У гэтым выпадку кошт паслугі будзе значна меншы. Хтосьці з заказчыкаў не жадае займацца дадатковымі клопатамі, і мы бяром усё на сябе.

Раней на сядзібе адпачывалі літоўцы, палякі, туркі, расіяне. Праўда, іх было не так шмат, у большасці «У Пятровіча» прымала беларусаў. Было, што і масквічы заязджалі проста, каб тут пераначаваць. Цяпер на аграсядзібе больш адпачываюць мінчане, а жыхары навакольных населеных пунктаў прыходзяць папарыцца ў лазні.

Падчас эпідэміі каранавіруса наведвальнікаў паменела, прызнаецца гаспадар. Ды і наогул, толькі на адных турыстах не заробіш. Таму ўпор робіцца на правядзенне карпаратываў. У той жа час вяселляў стала менш, а вось святкаванняў дзён нараджэння ды іншых мерапрыемстваў паболела.

Наогул, каранавірус паўплываў на ўнутраны турызм, прымусіў беларусаў звярнуць больш увагі на сваё, паколькі межы многіх краін былі закрытыя. Яны не змаглі выехаць у Турцыю, Егіпет, Індыю. Нават цяпер, калі некаторыя з краін знялі абмежаванні на ўезд, нашы суайчыннікі не надта гараць жаданнем пагрэцца на тамтэйшым сонейку — баяцца каранціну. Таму многія атрымалі магчымасць аціць мясцовы ўзровень сэрвісу, які год ад году паляпшаецца. Кожны гаспадар прыўносіць нешта новае ў арганізацыю адпачынку: ладзіць для сваіх кліентаў пешыя, конныя, лодачныя, велапрагулкі, катанне на конях і сабачых запрэжках, экскурсіі па знакамітых мясцінах, што дазваляе бліжэй пазнаёміцца з гісторыяй краіны, продкаў. А дзе за мяжой можна пасядзець на беразе ціхай рачулкі з вудачкай, пазбіраць у лесе грыбы і ягады?

— Ці падтрымлівае дзяржава вас фінансава, матэрыяльна падчас пандэміі? І якой бы дапамогі вам хацелася? — пацікавілася ў Максіма Пятровіча.

— Не перашкаджаюць працаваць — і тое добра, — усміхаецца ён. — Галоўнае, што не падымаюць адзіны падатак на наш від дзейнасці. Сёння мы ўносім адну базавую велічыню (27 рублёў) раз у год. Лічу, гэта амаль што бясплатна. Што тут яшчэ можна прасіць? Вядома, калі б мы арандавалі памяшканне, то, думаю, давялося б плаціць немалыя грошы. А так усё сваё. Акрамя таго, штогод плацім падатак на зямлю і нерухомасць.

Максім Аўчынікаў ні на кога не спадзяецца, разлічвае толькі на свае сілы і сілы сваёй сям'і. Сам выбірае і прывозіць будматэрыялы для пашырэння гаспадаркі, прадукты для кухні. Па меры паступлення грошай паціху стараецца будавацца.

Неяк спрабаваў узяць банкаўскі крэдыт на развіццё, але ад гэтай ідэі адмовіўся. «Вельмі шмат папер трэба прадставіць, патраціць шмат сіл і намаганняў, каб яго атрымаць», — кажа Максім Пятровіч.

— Прадстаўнікі малога і сярэдняга бізнесу кажуць, што для самаакупнасці неабходна адкрываць некалькі пунктаў гандлю, кавярняў або салонаў. А як у агратурызме? Дзейнічае гэтае правіла?

— Я набыў участак у Гродзенскай вобласці. Маю намер пабудаваць яшчэ адну аграсядзібу. Але цяпер разважаю: ці варта — вельмі шмат клопату. Ды і кіраваць гаспадаркай павінен не старонні чалавек, а сям'я. Былі выпадкі, калі ўладальнікі аграсядзіб наймалі сваякоў. І нават яны ўмудраліся падманваць.

Бізнес павінен быць толькі сямейны, бо хто, як не сям'я — бацькі, дзеці, сёстры, браты — зацікаўлены, каб ён развіваўся і квітнеў, прыносіў прыбытак, лічыць Максім.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. **Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 22 кастрычніка 2020 года.

РОДЫ-ПРЫГОДЫ

...Не так даўно маёй старэйшай дачцэ стукнула 50. Дата, вядома ж, прыгожая, круглая — юбілей, які грэх было не адзначыць, а тады ўжо — грэх не ўспомніць многае з пражытага і перажытага, пачынаючы з першага дня. За сталом я расказаў пра яго, субяседнікі паздзіўляліся-пасмяяліся... А вось мне тады ну зусім не да смеху было.

...Схваткі ў жонкі пачаліся ноччу. Здавалася б, справа жыццёвая: трэба выклікаць «хуткую» і пачакаць. Аднак у нашым становішчы ўсё гэта не мела сэнсу: па-першае, жылі мы ў вёсцы за трыццаць кіламетраў ад райцэнтра, па-другое, дарогі да нас не было і ў добрае надвор'е, а тут — зацяжныя дажджы. У выніку — не факт, што да «хуткай» хутка дазвонішся, што машына адразу ж выедзе... А галоўнае — аніякай гарантыі, што яна даедзе... Прасцей, як тады падумалі, будзе самім нам выехаць на нейкім мясцовым надзейным транспарце.

Вырашыць так было лёгка, а вось зрабіць...

Як на тое ліха, напярэдадні ў калгасе давалі палучку, таму шанцаў знайсці сярод шафёраў-трактарыстаў кагосьці больш-менш цвярозага было мала. Яшчэ менш, як здавалася, будзе ахвотных ноччу, па бездарожжы, за трыццаць вёрст везці парадзіху да Оршы... Значыць, мне яе мужу, заставалася адно: бегчы да Міколы, партарга калгаса. Ён, дзякаваць богу, спіртнога ў рот не браў.

Мусіць, таму мігам ацаніў сітуацыю, завёў грузавік (здаецца, «ГАЗ-51»?), мы з жонкай неяк «загрузіліся» і «памчалі» ў райцэнтр.

Машыну па дарозе трэсла і кідала з боку ў бок. Нас, пасажыраў, вядома ж, таксама. Я падтрымліваў жонку, як толькі мог: суцяшаў, абяцаў, што ўсё будзе добра... І нават не падманваў: кіламетраў сем мы, здаецца, ужо «адмахалі», калі раптам рухавік раз-другі тарганууся-чыхнуў і... заглух, бо Мікалай (на той час нават нежанаты), відаць, ад страху — за парадзіху, за немаўля — зусім забыўся, што бензабак у машыне амаль пусты.

З-за гэтага, відаць, ён адчуў сябе вінаватым, а таму, ні слова не кажучы, выскачыў з машыны і знік у цемры. Мы з жонкай засталіся ўдваіх і ў ціхай паніцы: ёй, падобна, вось-вось нараджаць, а навокал толькі дождж, халодная ноч ды бязлюднае поле...

На наша шчасце ў ім, як быццам, нешта заблішчэла? Так і ёсць: дзве фары... Машына... Мікалай... Ён прыехаў на малакавозе, які тутэйшаму шафёру дазвалялася трымаць ля хаты для таго, каб з мясцовай фермы як мага раней забіраць сыродаю...

Такім чынам мы з жонкай пераселі ў іншую машыну, і ўжо з яе рухавіка Мікола стаў выціскаць апошнія «конскія сілы». Мы ехалі, мы, можна сказаць, набліжаліся да мэты, калі...

На дарозе, як з-пад зямлі, вырас міліцэйскі патруль і загадаў спыніцца. Падстаў для гэтага было шмат. Па-першае, напярэдадні з аршанскай турмы збег нейкі злачынец, і, шукаючы яго, міліцыя правярала ўсе машыны... Па-другое, у кабіне нашай поруч з шафёрам сядзеў не адзін пасажыр, а двое (нават трое — амаль...). Па-трэцяе, бліжэй да горада дарога стала лепшая, і мы значна перавысілі хуткасць...

З якой канкрэтна прычыны, доўга расказваць не трэба было. Хлопцы, як выглядала, ужо мелі падобны вопыт, а таму адразу ўключылі «мігалку» і паехалі першыя. Мы — следам...

У выніку — усё паспелі. У нас нарадзілася дачка...

Дарэчы, стрыечны брат, які трохі пазней прыязджаў у адведкі, расказваў, што нашы роды-прыгоды — гэта яшчэ кветачкі. Ягадкі былі ў яго, калі да найбліжэйшай радзільні вёз сваю жонку ў санях, якія цягнуў... гусенічны трактар — такая была мяцеліца і такія гурбы...

Цяпер, як быццам, і дарогі добрыя, і машын розных шмат, і снягоў непразазных нямашака — толькі, здавалася б, нараджай. А людзі чамусьці не хочуць.

Мікалай Мікуціч,
г. Орша.

ВЫТОКІ ВЯЛІКАГА ШЛЯХУ

Людзі сталага ўзросту любяць параўноўваць, як было, як стала. Шмат што, ну вядома ж, змянілася да лепшага! Але і да горшага — таксама. Людзі роднай мовы цураюцца, мацюкаюцца — хоць на скаціну, хоць адзін на аднаго... А раней жа такога не было: мы з братам мацерных слоў аж да школы не чулі, хоць і ў вёсцы жылі. Там, пад гарачую руку, маглі пажадаць, каб чалавек нейкі долі не ведаў, каб сонца не бачыў, каб яго трасца трэсла... А найчасцей жа — каб куры стапталі і рак убрыкнуў, каб на беразе ўтапіўся, каб у чыстым полі дзверы прыціснулі...

Апроч гэтых праклёнаў, быў яшчэ адзін. Помню, сварацца суседкі ды жадаюць: «Госць на табе! Госць на табе! Госць...». Што азначала, — хай ён прыедзе (мо нават не адзін), хай уваліцца ў хату і там застанецца. А ты ўжо частуй, ты забаўляй...

Гэта, вядома ж, не пра ўсіх. У нашай хаце гасцей было шмат і, як правіла, добрых. Да гэтага віруса, напрыклад, амаль штогод прыязджала Танечка — мужава пляменніца: спачатку — старшакласніцай, потым — студэнткай, нявестай (удваіх са сваім жаніхом), маладой сямейкай...

Дык вось, у той год іх хлопчыку было гадоў, можа, з дзесяць. Харошае дзіця! Мы ўсе разам і ў цырк яго звадзілі, і ў лялечны тэатр, і на каток (летам), і ў мастацкі музей, і ў аквапарк... Заставалася, хіба што, у звычайны яшчэ скадзіць.

Гэты паход плануваўся апошнім, назаўтра госці збіраліся з'язджаць, таму хлопчык прасіўся на ўсе атракцыёны (хацеў, відаць, «адарвацца» напоўніцу?)

Трэба сказаць, што «адрыў» (нават у гэтым узросце) — справа не з танных. Аднак дзіцяці хіба адмовіш? Куплялі білецікі — недзе бацькі, недзе мы з мужам. «Чарга» тым часам да ціра дайшла.

— Можна мне паспрабаваць? — загарэўся ідэяй малы.

— Ну паспрабуй, — дазволіла маці, заплаціўшы, здаецца, за пяць патронаў. — Толькі ж глядзі — не міма...

— А калі ў мішэнь? — тут жа знайшоўся хлопчык. — Возьмеш яшчэ патронаў?

Муж мой на выручку:

— Я вазьму.

— А калі я зноў не прамахнуся?! — хітра прыжмурыўся Максім.

— ...Ну тады ўжо я заплачу, — велікадушна прамовіў «гаспадар» ціра.

Хлопчык узняў вінтоўку, старанна прыцэліўся і — як ні дзіўна — у яблычак, у дзясятку!

— Во дае! Мусіць, у секцыі недзе займаецца? — прагучала ў нас за спінамі.

— Ды не... Другі раз вінтоўку трымае, — не верачы сабе, казалі Максімавы бацькі.

Хлопчык тым часам выстраліў яшчэ раз... І яшчэ...

Мой муж палез у кішэнь па грошы, каб заплаціць за новыя патроны.

Потым (нідзе ж не дзенешся — абяцаў) раскашэліўся на іх і «гаспадар» ціра, побач з якім ужо сабралася чарга з ахвотных паўтарыць «подзвіг Максіма».

...У выніку яго самога адтуль мы ледзьве забралі! Хацелася мальцу і пастраляць яшчэ, і паглядзець. Нават больш за тое, з гэтай стральбы гісторыя толькі пачалася, бо Максім, вярнуўшыся дамоў, адразу ж запісаўся ў секцыю, хутка стаў кандыдатам і майстрам спорту. А далей — можа, і чэмпіёнам. Хай раскажа тады, што ягоны шлях на Алімп пачаўся зусім выпадкова, з пяці, здаецца, патронаў у ціры.

Алена Лявончык,
г. Мінск.

УРОК ФІЛАСОФІІ, альбо ЧАС СЕЯЦЬ І ЧАС ПРАСЕЙВАЦЬ

Днямі ў любімым часопісе прачытала, як хтосьці прыбег да Сакрата, каб паведаміць, што ягоны, Сакратаў, сябар гаворыць аб ім дрэнна... Ды філосафу гэта нецікава было, нават наадварот: ён сказаў «ганцу», што ўсё пачутае, перш чым «несці» далей, добра было б аж тройчы прасейваць. Ну, па-першае, праз сіта праўды: «Ты ўпэўнены, — спытаў ён у таго чалавека, — што пачуў менавіта яе, праўду?» — «Не, — прагучала ў адказ. — Але ж мне гаварылі...» — «Другое сіта, — праз нейкі час працягваў філосаф , — сіта дабрыні. — Падумай, ці ўзрадуе мяне твая навіна, ці будзе прыемная?» — «Не». — «Тады трэцяе сіта — карысці. Тое, што ты рвешся паведаміць, можа яе прынесці?» — «Наўрад ці...» — «Вось бачыш: ты хочаш расказаць навіну, у якой няма ні праўды, ні дабрыні, ні карысці. Тады навошта яна?»

Гэты дыялог нагадаў мне пра іншага філосафа — тутэйшага, вясковага.

...Пасля вайны, як вядома, мужчын засталося мала — раз, два і аблічыўся. Да таго ж — той стары, той малы яшчэ, той інвалідам з фронту вярнуўся, той кантужаным... З рукамі, з нагамі, з галавой у той вёсцы двое было, і самы прывабны, вядома ж, брыгадзір. Ад яго вельмі шмат што залежала і вельмі шмат хто. Хапала ў вёсцы гаротніц-жанчын ды маладых удоў. Многіх брыгадзір падтрымліваў...

Дык вось, неяк да ягонай жонкі, як да таго Сакрата, прыбягае адна з суседак і з парога:

— Цётка Тася, а ваш дзядзька цяпер з Палінкай...

Тая ў адказ:

— Пачакай, я карову падаю, — тады раскажаш.

Суседцы хочацца зараз жа, але што ты будзеш рабіць?! Прысела на нейкі зэдлік, сядзіць, чакае. Бачыць: цётка ад каровы ідзе, і адразу ж за сваё:

— Слухайце: дык ваш дзядзька...

Цётка ў адказ:

— Ты яшчэ крыху пачакай... Я свінням занясу.

— Добра, — згаджаецца суседка, падумаўшы, што вось гэта ж хутка?

І сапраўды, цётка жвавенька — і ў хлеў, і назад:

— Зараз, — зноў «госці» кажа, — я толькі рукі памыю...

А суседцы ўжо і крыўдна: яна спяшалася, бегла — такую навіну ў хату несла, а тут на табе: расказаць не даюць:

— Садзіся, — кажа гаспадыня, — разам павячэраем.

— Ды не буду я есці!

Ну і цётцы няёмка адной.

— Дык што ты хацела казаць? — пытае ў суседкі.

— Ат... Мусіць, позна ўжо? — адмахваецца тая. — Бабы гаманілі, што ваш дзядзька да Палінкі пайшоў. Вы — маглі б следам... Адразу... А зараз — што — яны, відаць, разышліся...

Выслухала ўсё гаспадыня, падышла да печы, узяла качаргу (хто забыўся, гэта прылада такая, каб попел выграбаць) — абаперлася на яе і гаворыць суседцы:

— Паслухай сюды: калі табе раптам нешта спатрэбіцца — ну, пазычыць, ці параіцца, дапамагчы, — то, калі ласка, прыходзь. Я табе не адмоўлю. А вось калі яшчэ раз такую навіну прынясеш, — наракай на сябе: качаргой агрэю так, што мала не падасца.

...Згадзіцеся: мудрая была жанчына, хоць, як той казаў, Сакратаў не чытала...

А каб ёй ды навуку?

Любоў Чарнец,
г. Барысаў.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Приорбанк RBI Group

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2020 г.

«Приорбанк» Открытое акционерное общество

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	На 1 октября 2020	На 1 января 2020
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		276 616	129 374
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		-	-
4	Средства в Национальном банке	1103		513 820	619 465
5	Средства в банках	1104		579 783	645 107
6	Ценные бумаги	1105		457 977	286 328
7	Кредиты клиентам	1106		3 271 290	2 684 263
8	Производные финансовые активы	1107		4 443	172
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		33 380	25 888
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		171 610	173 474
11	Доходные вложения в материальные активы	1110		1 302	1 906
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111		662	7 086
13	Отложенные налоговые активы	1112		-	-
14	Прочие активы	1113		32 004	39 249
15	**ИТОГО активы**	**11**		**5 342 887**	**4 612 312**
15	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
16	Средства Национального банка	1201		-	-
17	Средства банков	1202		262 488	228 121
18	Средства клиентов	1203		4 146 337	3 563 135
19	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		96 370	53 092
20	Производные финансовые обязательства	1205		1 218	616
21	Отложенные налоговые обязательства	1206		-	-
22	Прочие обязательства	1207		51 910	58 279
23	**ВСЕГО обязательства**	**120**		**4 558 323**	**3 903 243**
24	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**				
25	Уставный фонд	1211		86 148	86 148
26	Эмиссионный доход	1212		-	-
27	Резервный фонд	1213		180 609	126 738
28	Фонды переоценки статей баланса	1214		79 844	81 503
29	Накопленная прибыль	1215		437 963	414 680
30	ВСЕГО собственный капитал	121		784 564	709 069
31	**ИТОГО обязательства и собственный капитал**	**12**		**5 342 887**	**4 612 312**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 октября 2020 г.

«Приорбанк» Открытое акционерное общество

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	На 1 октября 2020	На 1 октября 2019
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		225 744	210 813
2	Процентные расходы	2012		77 185	59 376
3	Чистые процентные доходы	201		148 559	151 437
4	Комиссионные доходы	2021		156 616	144 397
5	Комиссионные расходы	2022		80 463	68 260
6	Чистые комиссионные доходы	202		76 153	76 137
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		(3 358)	(2 227)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		71 075	42 280
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		1 537	2 222
11	Чистые отчисления в резервы	207		60 477	(3 829)
12	Прочие доходы	208		16 486	6 088
13	Операционные расходы	209		134 897	125 951
14	Прочие расходы	210		12 674	11 828
15	Прибыль до налогообложения	211		102 404	141 987
16	Расход по налогу на прибыль	212		25 987	33 611
17	**ПРИБЫЛЬ**	**2**		**76 417**	**108 376**

Председатель Правления С.А. Костюченко

Главный бухгалтер В.В. Манцивода

Финансовая отчетность размещена на интернет-странице банка: **https://www.priorbank.by/kvartal-nye-otcety**

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 12 от 06.05.2013 года. УНП 100220190

«Крытыкі «Вішнеўскі спецыяльна пісаў,

Януш Вішнеўскі не адчувае сябе пісьменнікам

Калегі-навукоўцы восем гадоў не ведалі, што паважаны прафесар, хімік-інфарматык — аўтар рамана-бестселера пра каханне.
Больш за тое, згаданы аўтар дасюль не лічыць сябе пісьменнікам, хоць на яго рахунку тры дзясяткі мастацкіх кніг, што разыходзяцца мільёнамі асобнікаў па ўсім свеце.
Біяхімік, які дакладна ведае ўсё пра гармоны-феромоны, хімічнае «закулісе» эмоцый, у 44 гады напісаў адзін з самых эмацыянальных раманаў пра «нелагічнае» каханне — «Адзінота ў сеціве». За тры гады пасля гэтага дэбютант атрымаў 18 055 лістоў ад чытачоў.
У рамана з'явілася польская экранізацыя, якую Януш Лявон Вішнеўскі характарызуе «вельмі кепска», і сцэнічная адаптацыя ў Санкт-Пецярбургу — «вельмі добрая».
Нядаўна ў рамана з'явіўся працяг, і вось ужо сіквэл перакладзены на беларускую мову пад назвай «Канец адзіноты» — цудоўная нагода сустрэцца з нашымі чытачамі.
З Янушам Вішнеўскім мы гутарылі ў мінскай краме «Акадэмкніга», якраз напярэдадні яго выступлення перад узрадаванымі беларускімі прыхільнікамі, якія ўсё падыходзілі і падыходзілі, і зацікаўлена прыслухоўваліся да нашай размовы. Я паабяцала, што «пра каханне» пытацца не буду — бо гэта тое, пра што ў пана Януша пытаюцца ўвесь час. Але іншую «адзнаку» яго творчасці абмінуць не ўдалося...

РАМАН ЯК ЛЯЧЭННЕ Ў ПСІХАТЭРАПЕЎТА

— «Адзінота — хранічная прастуда душы», — сказалі вы. А яшчэ — што каб пісаць, неабходная адзінота. Але ў якім сэнсе — як адсутнасць мітусні побач, адасабленне, ці як стан душы? У такім выпадку, гэта боль ці спакой?

— Я больш меў на ўвазе спакой. Гэта тая адзінота, якой я хачу, якую я шукаю. Быць сам-насам са сваімі думкамі. Не тое пачуццё, калі не знайшоў чалавека, які хацеў бы з табой быць, альбо ты не хочаш быць з кімсьці, — такое пачуццё балючае, хваравітае. Усе свае кнігі я напісаў на самоце, калі ў пакоі нікога апроч мяне не было. Зрэшты, гэта было лёгка. Я шмат гадоў жыў у Германіі. У мяне была маленькая кватэра недалёка ад офіса, за 60 метраў — што вельмі небяспечна, таму што ты нібыта заўсёды працуеш. Калі ноччу мне прыходзіла нешта ў галаву, я накідваў паўзверх піжамы паліто і ішоў у офіс. Сёння са мной жывуць трое — мая жанчына і яе два сыны. Але калі пачынаю пісаць, зачыняю дзверы, і ўсе ведаюць, што мяне не трэба турбаваць. Ніхто не чытае мой рукапіс да таго, як я пашлю яго ў выдавецтва. Я не хачу, каб мая жанчына ўплывала на тое, што я пішу. Яна чытае, толькі як выйдзе кніжка, нароўні з іншымі чытачамі.

— Часам я, займаючыся з маладымі літаратарамі, даю практыкаванне: успомніць сваю дзіцячую крыўду і ператварыць у мастацкі твор. Апісаць не адзін да аднаго (бо гэта будзе медыцынская картка, а не апавяданне), а пераасэнсаваць, зірнуць на падзеі збоку, з адлегласці, вокам мастака... Ваша прага да вывучэння феномена адзіноты — можа, таксама гэткая спроба пераасэнсаваць дзіцячую крыўду? Ад таго часу, калі чатырнаццацігадовы вы апынуліся далёка ад дому, паступіўшы ў марское вучылішча?

— Так, у той час я сябе адчуваў вельмі самотна. Вядома, гэта адбілася... Але адразу скажу: я не адчуваю сябе пісьменнікам. Я лічу сябе проста аўтарам кніг. Калі вы спытаеце мяне, хто я, я адкажу: «Я — вучоны, пішу праграмы па хіміі, кандыдат інфарматыкі, доктар, працую ў дакладных навуках. А ў вольны час пішу кнігі». Мне пашанцавала, што гэтыя кнігі людзі чытаюць і даюць мне самае важнае. Не грошы, якія трацяць на куплю маіх кніг, а свой час, які ахвяруюць на тое, каб іх прачытаць. Ведаю, ёсць шмат маладых людзей, якія мараць выдаць кнігу, бо думаюць, што займеюць папулярнасць, грошы... Я пачаў пісаць, таму што перажываў жарсць. Вялікую жарсць. Заканчваўся мой шлюб, жонка хацела са мной развесціся, я адчуваў сябе кепскім мужам, таму што ў мяне не было часу для сям'і, я быў так заняты сваімі навуковымі праектамі, што яны захінулі ад мяне ўвесь свет. Я не меў часу пачытаць казкі дзецям. Жонка перастала верыць у тое, што ў дзве гадзіны ночы былі

«Маладыя дзяўчаты ва ўзросце 15—17 гадоў пра секс з татам не гавораць, яны перакананыя, што ў таты секс быў два разы — «калі радзілася я, а пасля — калі мая сястра».

заторы на вуліцах, а я ўвесь час выкарыстоўваў гэту ману. Я быў вельмі нешчаслівы і пайшоў да псіхатэрапеўта — у Германіі гэта бясплатна. Жанчына-псіхатэрапеўт, вельмі мудрая, сказала, што мне трэба аналізаваць свае пачуцці. Весці дзённік і апісваць, што я адчуваю — увечары, раніцай, на працы... Што думаю пра жонку, пра дзяцей. Доктар не хацела сама гэтага чытаць. Яна сказала: «Пішыце на польскай мове, я яе не разумею. Самае галоўнае, каб вы пісалі». Так пачаўся раман «Адзінота ў сеціве». Я, аднак, пісаў не толькі пра сябе, выкарыстоўваў сюжэты з жыцця іншых людзей. Пры гэтым кожны герой — гэта я, нават жанчыны. Мае гераіні перажываюць тое, што я перажываў. Гэта былі вялікая жарсць і вялікі сум. Таму кніга атрымалася вельмі сумная.

«Я КРАДУ Ў ЛЮДЗЕЙ ГІСТОРЫІ»

— З аднаго боку, сучасны чалавек увесь час знаходзіцца ў сацыяльных сетках, у нейкай камунікацыі. З другога боку, ён развучыўся быць самотным, быць сам-насам з сабою, весці ўнутраны дыялог. Усе допісы ў «Інстаграме», «Фэйсбуку» — стварэнне штучнай асобы для чужых вачэй. А творчасць — як «Салярыс» Станіслава Лема, калі ты, выкарыстоўваючы жывую матэрыю чужога быцця, рэалізуеш уласныя патаемныя жаданні. Пра гэта я ўспомніла, калі чытала ваша апавяданне «Сіндром праклёну Ундзіны», дзе гераіня прыдумляе сабе віртуальнага сябра, абаронца.

— Так, працэс пісання пра свае адчуванні сапраўды выратаваў мяне. Я ведаў, што я — кепскі муж, таму зрабіў героя сваёй кнігі ідэальным. І стварыў для яго сусвет, жанчыну, каханне. Я ўзяў яго рысы ў розных маіх знаёмых, сабраў гэтакі пазл: пачуццёвасць — ад аднаго, інтэлігентнасць — ад другога. Гэта кепска, таму што я падмануў шмат жанчын.

— Уласна кажучы, што такое мастацтва і літаратура? Вялікі падман. Вартасць толькі ў праўдападобнасці.

— У маёй кнізе падману менш, чым у іншых, таму што ў мяне ёсць праблема, як у прадстаўніка дакладных навук: я не ўмею выкарыстоўваць фікцыю, выдумку. Да свайго першага рамана я напісаў шмат навуковых кніг і артыкулаў. А ў навуковых артыкулах трэба заўсёды даваць спасылкі, адкуль ты пра тое ці іншае даведаўся. У мяне было адчуванне, калі пісаў раман, што я таксама павінен даваць спасылкі, адкуль я ведаю якую-небудзь гісторыю, хто мне яе распавёў. Так што са мной небяспечна мець зносіны, я магу апублікаваць тое, што мне раскажуць. Я краду ў людзей іх гісторыі. Вядома, нешта мяняю. Змешваю гісторыі розных людзей у адну, але ўсе сюжэты рэальныя. Літаратурная выдумка мае сваю мяжу, рэальнае жыццё не мае ніякіх межаў.

— У апошнім рамане вы гаворыце ад імя дваццацігадовага героя. Наколькі гэта лёгка? Ментальнасць пакаленняў мяняецца ўсё хутчэй, праходзіць дзесяць гадоў — і гэта ўжо іншыя людзі...

— У «Адзіноце ў сеціве» ў гераіні рамана ў выніку ўсяго нараджаецца сын, якога яна называе Якаб. Ёсць дакладныя даты — сын павінен нарадзіцца ў 1997-м, а значыць, у 2017-м яму мусіць быць дваццаць гадоў. Я не думаў, што напішу працяг «Адзіноты». Але калі наважыўся, вырашыў, што напішу з пункту гледжання згаданага сына. Ведаеце, я ніколі не губляў кантакту з маладымі людзьмі. Калі я працаваў у Франкфурце прафесарам ва ўніверсітэце, любіў сустракацца са сваімі студэнтамі. Мне пашанцавала, што мае дочкі заўсёды хацелі са мной размаўляць. Не ў кожнага бацькі так атрымліваецца. Вядома, пра сваё інтымнае жыццё гаварылі з маці, а не з бацькам. Маладыя дзяўчаты ва ўзросце 15—17 гадоў пра секс з татам не гавораць, яны перакананыя, што ў таты секс быў два разы — «калі радзілася я, а пасля — калі мая сястра». Калі дочкі прачыталі маю кнігу «Адзінота ў сеціве», у іх быў сапраўдны шок. Глядзелі на мяне вялізнымі вачыма: «Тата? Эротыка? Каханне? Ён павінен займацца толькі алгарытмамі і хіміяй!» Доўгі час гаварыць пра гэтую кнігу было табу ў нашай сям'і. Яшчэ я шмат падарожнічаў паміж Польшчай і Франкфуртам-на-Майне, выкарыстоўваючы BlaBlaCar, гэткі сучасны аўтастоп, калі праз сецівa дамаўляешся браць спадарожнікаў. Ім карыстаюцца галоўным чынам маладыя людзі. Я на BlaBlaCar ужо ў статусе «амбасадор», гэта значыць, што ездзіў вельмі шмат. Я ж выпраўляўся з Германіі амаль кожныя другія выхадныя ў Польшчу да сваёй жанчыны альбо на сустрэчу з чытачамі. Заўсёды браў маладых людзей і правакаваў на размовы. Некаторыя пазнавалі мяне: «А, пан Вішнеўскі!» Некаторыя даведваліся, хто я, падчас падарожжа. Калі гучала назва «Адзінота ў сеціве», узрушваліся, рабілі са мной сэлфі. І распавядалі мне свае гісторыі, я слухаў, нават «услухваў» сябе ў гэтыя гісторыі. Мае спадарожнікі ведалі, што могуць быць шчырыя, бо мы можам ніколі больш не сустрэцца.

— Здаралася, што пасля яны пазнавалі сябе ў вашых героях?

— Так. У апошнім рамане ў мяне ёсць гісторыя пра жанчыну, якая працавала ў салоне прыгажосці, але марыла быць шафёрам агромністага грузавіка, як яе брат. Яна касметолаг, а хацела быць шафёрам. Гэта ненармальна. Маленькая такая жанчына...

— Ну чаму ж ненармальна?

— Не так часта сустракаюцца сярод шафёраў-міжнароднікаў, якія ездзяць ад Польшчы да Партугаліі на вялізных фурах, маленькія жанчыны. Але яна сваю мару рэалізавала. Ехала са мной на BlaBlaCar ад Гданьска, таму што ёй трэба было забраць грузавік у Берліне.

КАЛОНКА Ў ЖАНОЧЫМ ЧАСОПІСЕ

— А ці здаралася, калі герой быў незадаволены, што яго гісторыю абнародавалі?

— Не. Бо я так змешваю рэальныя сюжэты, што цяжка пазнаць, хто ёсць хто. Напрыклад, усё адбывалася ў Берліне, а я пішу, што ў Варшаве. Было ў 1970-х, а я пераношу ў 2000-я. І ніколі не выкарыстоўваю рэальнае імя. У першай кнізе «Адзінота ў сеціве» гераіня ўвогуле не мае імя, у другой кнізе, «Канец адзіноты», яна ўжо дазволіла мне выкарыстаць сваё рэальнае імя. Адзін раз толькі была праблема... Я на працягу пятнаццаці гадоў вёў калонку для жаночага глянцавага часопіса «Пані». Аднойчы апісаў трагічную гісторыю, якая адбылася, калі мы з жонкай былі ў Балгарыі. У самалёце разам з намі ляцелі на адпачынак дзевяцігадовая дзяўчынка з цёткай. У Балгарыі, на пляжы, цётка адышлася, каб купіць пляменіцы ліманаду. А дзяўчынка ўвайшла ў мора і патанула. Жахліва... І тая жанчына мусіла ляцець назад і растлумачыць сваёй сястры, што дачка той памерла, таму што

абураліся: каб усе плакалі!»

і шукае сюжэты на BlaBlaCar

яна пайшла купіць ёй ліманаду. На могілках, непадалёк ад месца, дзе ляжыць мой бацька, пахавалі тую дзяўчынку. На яе магіле выява марской хвалі. Я туды заўсёды падыходжу. Я расказаў пра гэта ў сваёй калонцы праз дзевяць гадоў пасля трагедыі. І мне напісала сваячка гэтай дзяўчынкі, што я не павінен быў пра гэта пісаць, у мяне няма на тое права, бо я камусьці адкрываю старыя раны. Хоць я не называў рэальныя імёны, згадаў іншы горад. Але людзі пазналі сваю гісторыю. Ды гэта адзіны такі выпадак. А жанчына-шафёр грузавіка напісала мне, што яна ўдзячная.

— На ментальнасць цяперашніх пакаленняў не можа не паўплываць пандэмія каранавіруса... Некаторыя параўноўваюць гэта з сярэднявечнымі эпідэміямі чумы, пасля якіх змянілася філасофія, мастацтва, літаратура — усё. Пачалася эпоха Адраджэння з антрапацэнтрызмам, вяртаннем цікавасці да цялеснага.

— Небяспека каранавіруса ў тым, што мы не ведаем, што ён робіць з намі, якія яго наступствы. Хвароба можа быць бессімптомная, але як уплывае на арганізм — невядома. Статыстыка смерцяў ад каранавіруса меншая, чым ад грыпу, але мы не ўмеем яго лячыць. Думаю, што пасля пандэміі, пасля самаізаляцыі чалавецтва зменіцца. У Польшчы ўсё было зачынена, усе сядзелі па дамах, сустрэчы з чытачамі адмяніліся. Для многіх гэта была неверагодная трагедыя. Для мяне — не. Калі я параўноўваю сваё жыццё ў Франкфурце з самаізаляцыяй падчас пандэміі, гэта не надта адрозніваецца. Восем гадзін я сядзеў у маленькай кватэры, восем гадзін — у офісе, дзе таксама быў самотны. Можа, пару разоў на тыдзень сустракаўся з іншымі работнікамі. У дзевяць-дзесяць вечара я зноў вяртаўся ў сваю кватэру. Хіба што, не трэба было насіць маску, і я мог адысці ў краму, купіць віно. Але гаварыў амаль толькі з камп'ютарамі. Праўда, цяпер у Польшчы са мной была мая жанчына, якая працуе ў гімназіі выкладчыцай польскай мовы. І мы так шмат гаварылі, як ніколі. Яе дзеці былі занятыя гульнёй на камп'ютарах. Я чытаў вельмі шмат кніг, тэлефанаваў людзям, якія, я ведаў, самотныя. За час самаізаляцыі многія зразумелі, у якой ступені важныя стасункі паміж людзьмі. Гэта пазітыўны вынік пандэміі. Людзі засумавалі па блізкасці. Шмат пар падчас пандэміі развяліся. Таму што для іх быў жах — размаўляць з адной і той жа жанчынай ці тым жа самым мужчынам цэлыя днямі, быць разам дваццаць чатыры гадзіны ў суткі. Многія сужэнцы першы раз насамрэч пазнаёміліся адно з адным, бо адносіны ў сучасных шлюбах такія, што застаецца толькі інфармацыя на стыкеры на халадзільніку. Згодна са статыстыкай, людзі, якія ў шлюбе пятнаццаць гадоў, размаўляюць адно з адным дзевяць хвілін у суткі. Усе ведаюць феномен Японіі, дзе людзі маюць па чатыры месцы працы; найбольшая колькасць разводаў выпадае на перыяд, калі муж выходзіць на пенсію. Таму што ён цяпер дома, і жонка даведваецца, які ён чалавек. Раней яна бачыла яго раніцай, прасавала яму свежую кашулю, а пасля сустракала вечарам, калі ён ужо быў п'яны. Бо вечарам, як усе, піў піва і спяваў у караоке. І лічба разводаў у Японіі для людзей, якім за шэсцьдзясят, велізарная. Тое самае — пасля пандэміі. Я асабіста ведаю шмат пар, якія развяліся. Але ведаю і некалькі такіх, якія наноў захацелі адно ў аднаго падчас самаізаляцыі.

ТРОХІ ЎПРАВА — КІЧ, УЛЕВА — МЕЛАДРАМА

— Вы неяк казалі, што вашы кнігі чытачы абмяркоўваюць на незалежным партале, дзе ўсё вельмі аб'ектыўна. Мне ўвогуле цяжка ўявіць, што магчымая такая цалкам аб'ектыўная пляцоўка... Тым больш вы заўважылі, што меркаванні чытачоў і крытыкаў процілеглыя.

— Пра аб'ектыўнасць можна казаць толькі ў тым сэнсе, што на выказванні чытачоў на тым партале не ўплывае ні выдавецтва, ні кніжная крама, якая дала грошы крытыку з просьбай напісаць ухвальную рэцэнзію. А крытыкі ў Польшчы мяне не любяць. Я меў вельмі кепскія рэцэнзіі. Першую адмоўную рэцэнзію я прачытаў, калі мяне запрасілі ў Варшаву на кніжную выстаўку. Я так перажываў, што хацеў перад паездкай уздзець маску, каб мяне не пазналі.

«Пры гэтым кожны герой — гэта я, нават жанчыны. Мае гераіні перажываюць тое, што я перажываў. Гэта была вялікая жарсць, і вялікі сум. Таму кніга атрымалася вельмі сумная».

Але літаратура ніколі не была крыніцай майго існавання. Калі я перастаю пісаць, я нічога не страчу. Каго вы крытыкуеце? Хіміка, інфарматыка? Гэта для мяне гонар, калі літаратурныя крытыкі пішуць пра кнігу хіміка. Зрэшты, і крытыкам было нялёгка сарыентавацца. Аўтар не быў у літаратарскім коле. Не жыў у Польшчы, меў шмат навуковых ступеняў, больш, чым тыя крытыкі. Пісаў на банальныя тэмы, пра каханне. Сюжэт жа «Адзіноты ў сеціве» вельмі банальны, звычайны трохкутнік — жонка, муж, каханак. Але нешта ёсць у гэтай кнізе, чаму столькі людзей захацела яе прачытаць! Да таго ж да аўтараў бестселераў адносіны адмоўныя ад пачатку. Логіка такая: «Нашто Вішнеўскаму грошы, у яго і так два «Мерседэсы»? Чаму яму дастаецца агромністая частка торта? Няхай бы куплялі бедных аўтараў, якія не маюць нічога». «Адзіноту ў сеціве» абвінавачвалі ў меладраматызме. Маўляў, «Вішнеўскі спецыяльна напісаў, каб вы плакалі. І гэта кан'юнктура, бо калі вы плакалі, вы не забудзеце пра кнігу. «Так, жанр, у якім я працую, небяспечны. Трохі ўправа — кіч, улева — меладрама. Мне трэба было прайсці па мяжы і не ўпасці.

В'ЕТНАМСКІ ХІТ

— Вашы кнігі шмат перакладаюць. Вы казалі, што яны дужа папулярныя ў В'етнаме і Кітаі...

— У В'етнаме больш, чым у Кітаі. Усяго пераклалі на дзевятнаццаць моў, апошняя мова, дзевятнаццатая, — беларуская.

— З перакладамі мастацкіх твораў заўсёды небяспечна, наколькі яны адпавядаюць арыгіналу. Я чытала раман нямецкага аўтара Давіда Кельмана «Слава» пра пісьменніка, які зрабіўся неверагодна папулярны ў адной з азіяцкіх краін, дзе яго друкуюць велізарнымі накладамі. А калі ён нарэшце туды трапляе, высвятляецца, што пад яго імем і назвай выдаецца востры раман мясцовага аўтара, які іначай не быў бы выдадзены.

— Сюжэт Кельмана выдатны, я люблю гэтага аўтара. Але я быў у В'етнаме і ўпэўнены, што там выдадзена менавіта мая кніга! Зараз мая в'етнамская перакладчыца скончыла пераклад рамана «Канец адзіноты». Якасць, вядома, не магу ацаніць, але людзі кажуць, што пераклад добры. І тут свая незвычайная гісторыя. Перакладчыца была студэнткай у Польшчы ў час в'етнамскай вайны, калі сацыялістычныя краіны дапамагалі студэнтам з В'етнама, запрашалі на вучобу. Калі яна вярнулася на Радзіму, не забыла польскую мову. Яе сын, скрыпач, адправіўся вучыцца ў Гданьск. Там ён пазнаёміўся са студэнткай з Японіі, якая іграла на фартэпіяна. Яны пакахалі адно аднаго і прыехалі жыць у В'етнам. І вось цяпер ёсць кватэра ў Ханоі, дзе жанчына з Японіі, мужчына з В'етнама і яго маці з В'етнама гаворыць выключна на польскай мове, таму што толькі на гэтай мове могуць адно аднаго зразумець.

— Расійскі акадэмік Аляксей Лосеў сцвярджаў, што мова — жывая стыхія са сваёй ментальнасцю, якая ўплывае на ментальнасць носьбіта мовы, і асабліва на пісьменніка, для якога мова — больш чым інструмент.

— Так, мова генерыруе эмоцыі. Я ведаю. Нават напісаў пра гэта сюррэалістычную кнігу «На «Фэйсбуку» з сынам». Гэта мае размовы з маці, якая даўно памерла, але, я ўпэўнены, сёння мела б сваю старонку ў «Фэйсбуку». Я даўно марыў, каб якая-небудзь мая кніга выйшла на беларускай мове яшчэ з 2013 года, калі першы раз быў у Мінску. І вось здзейснілася — у выдавецтве «Янушкевіч» у перакладзе Кацярыны Маціеўскай і Ганны Янкуты з'явіўся мой раман, раней, чым у перакладзе на рускую. І я рады, што дзякуючы Польскаму інстытуту, які мяне запрасіў, магу гэтую кніжку тут прадстаўляць. Я засумаваў па такіх сустрэчах, бо з-за пандэміі яны перапыніліся.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

Неасабісты суб'ектыў

Цягнік ляцеў у восеньскую ноч...

Не ўсё, што ты лічыш добрай справай, можа ў выніку менавіта дабром аказацца

КОЛЬКІ гадоў мінула, а не дае спакою, цвеліць памяць і сумленне адзін успамін. Асабліва гэтым часам, калі вечары становяцца цёмныя і самотныя, калі ківаюцца ў акне задраныя ўгару бязлістыя пальцы дрэў, а вецер стукае ў шыбу, бы злосны п'яніца, які па ночы збіўся з дарогі. Мы тады былі студэнтамі, нам было гадоў мо па дваццаць. Такімі вось цёмнымі восеньскімі вечарамі ў паўгалодных дзевяностых мы, не зважаючы на холад у інтэрнацкім пакоі, вельмі здорава бавілі час за танным малдаўскім віном, якое прадавалася закатаным у трохлітровыя слоікі, ды нарэзанымі скрылікамі яблыкаў, пакладзенымі на лусты «Нарачанскага» хлеба. Падобныя вячоркі ніколі не былі п'янымі, хутчэй, злёгку захмялелымі, калі плятуцца цікавыя размовы, вядуцца гарачыя разумныя спрэчкі, чытаюцца ўласнаручна напісаныя вершы, прыдумляюцца дасціпныя жарты. Тады (думаю, нам у гэтым вельмі пашанцавала) не было ні гаджэтаў, ні нават інтэрнэту. Карацей, падгледзець і пазычыць думкі, словы, дзеянні ў рэжыме анлайн проста не было дзе, таму кожны кіраваўся ўласнымі здольнасцямі, досведам, інтуіцыяй. Залатыя былі часы!

Дык вось аднойчы такім вечарам, калі не было чаго рабіць (да сесіі было яшчэ далёка), калі ўсё было перасмяяна і перагаворана, мы вырашылі пагуляць у фанты. Ну, памятаеце гэтую з дзяцінства вядомую забаўку — кожны аддае якуюсь сваю рэч, і «вядучы» з завязанымі вачыма загадвае, што таму ці іншаму «фанту», дакладней, яго ўладальніку, рабіць. Пад агульны рогат мы што толькі ў той вечар ні вытваралі на сваім восьмым паверсе. І ў дзверы людзям грукалі, і голасам каменданткі на ўвесь калідор крычалі «Усе на праверку!», і змесціва каструль на кухні вывучалі і змешвалі... Калі ж нарэшце ў шапцы засталося тры фанты, вядучы раптам выдаў: «Знайсці няшчаснага чалавека і зрабіць яго шчаслівым!» Уладальнікі задання, сярод якіх была і ваша пакорная слуга, спачатку сумеліся, а пасля камусьці прыйшла ў галаву «геніяльная» ідэя (мы ж на творчым факультэце як-ніяк вучыліся). Вырашылі пайсці на зусім недалёкі вакзал, знайсці якога бамжа — тады іх паўсюль хапала, і пачаставаць яго рэшткамі нашай вячэры. Хтосьці нават дзеля гэтай гуманітарнай місіі выцягнуў з запасаў бляшанку тушонкі, і мы натоўпам у палове дванаццатай ночы рушылі па Ульянаўскай на Прывакзальную плошчу.

